НЕ БУДАВАЦЬ ПЛАТЫ, А НАЛАДЖВАЦЬ ДЫЯЛОГ 6





РАДЗІМА БЫВАЛЫХ ЛЮДЗЕЙ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
19 ЛІСТАПАДА 2024 г. АЎТОРАК № 225 (30359)

З першых вуснаў

## «МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ — ГЭТА МОЦНАЯ КРАІНА! ГЭТЫМ ШЛЯХАМ МЫ БУДЗЕМ РУХАЦЦА. ГЭТА ЎЖО НЕ ТАКТЫКА — ГЭТА ЎЖО СТРАТЭГІЯ»

### Пра што кіраўнік дзяржавы размаўляў з жыхарамі Магілёўшчыны



Фота БелТА.

**Марафон ушанавання аграрыяў з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі завяршаецца на Магілёўшчыне. Абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі» ў суботу прынялі Клімавічы, куды прыехаў і кіраўнік дзяржавы.**

І першыя каментарыі ад Прэзідэнта мясцоваму кіраўніцтву — на рабочыя тэмы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на рацыянальнае выкарыстанне зямель у Магілёўскай вобласці, у прыватнасці прысядзібных і прыфермерскіх участкаў, якія цяпер пустуюць. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, аблятаючы вобласць, з борта верталёта ён бачыць, як каля былой фермы пустуе зямля. І гэта праблема ўсёй краіны. «Губернатараў у гэтым плане трэба падсцёбваць. Асабліва старшынь райвыканкамаў. Гэта іх землі, іх трэба ў парадак прыводзіць, умеюць жа рабіць», — запатрабаваў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што праблема закінутых зямель датычыцца і аграгарадкоў. Сёння людзям не патрэбны вялікія ўчасткі. Большасці хапае паловы гектара, 40 сотак. А астатняе кінута. Аляксандр Лукашэнка даручыў узяць на кантроль гэтае пытанне старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі і ўпаўнаважанаму прадстаўніку кіраўніка дзяржавы ў Магілёўскай вобласці Леаніду Зайцу.

### Усе розныя, а сям'я адна

Размова з жыхарамі Клімавічаў і гасцямі фестывалю-кірмашу хоць і мела святочны характар, але не абышлася без важных, злабадзённых тэм. У пачатку сваёй прамовы Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што ў Клімавічах адчувае сябе як дома.

СТАР. 2–3

## «У НАС АГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ, АГУЛЬНАЕ ЦЯПЕРАШНЯЕ. І Я ПЕРАКАНАНЫ, ШТО БУДУЧЫНЯ Ў НАС ПАВІННА БЫЦЬ АГУЛЬНАЙ»

### У чым пункты росту супрацоўніцтва Беларусі і Смаленскай вобласці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Смаленскай вобласці Васілём Анохіным. Кіраўнік суседняга рэгіёна толькі сёлета пяць разоў наведваў нашу краіну, але ў Палацы Незалежнасці ён упершыню.**

«Рыхтуючыся да гэтай сустрэчы, як гісторык я падумаў аб тым, што нас можа ўвогуле раздзяліць, у чым мы не падобныя адзін да аднаго. Мы абсалютна аднолькавыя. У нас агульная гісторыя, у нас агульнае цяперашняе. І я абсалютна перакананы, што будучыня ў нас павінна быць агульнай», — прывітаў гасцей Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі і Смаленскай вобласці вельмі шмат агульнага. «Вы ведаеце маю пазіцыю: я не прытрымліваюся таго пункту гледжання, што, каб разам развівацца, быць ідэнтычнымі, глядзець у будучыню аднолькава, трэба абавязкова ўсіх аб'яднаць у нейкую дзяржаву ці нейкае аб'яднанне. Ведаеце, свет развіваецца хутка. І мне здаецца, хутка чалавеку будзе ўсё роўна, дзе ён жыве. Ён будзе грамадзянінам свету. Але пакуль сітуацыя развіваецца такім чынам: ёсць Беларусь, ёсць Расія, ёсць вобласці Гомельская, Магілёўская, Віцебская, Смаленская, Бранская, Пскоўская», — адзначыў беларускі лідар, зрабіўшы акцэнт на тым, што суседзі павінны супрацоўнічаць больш цесна, бо іх сапраўды шмат што звязвае.

### З суседзямі трэба жыць у міры

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што беларусы заўсёды актыўна дапамагалі Смаленскай вобласці, калі ў гэтым узнікала неабходнасць. У прыклад ён прывёў беларускіх аграрыяў, якія, скончыўшы ўборку збожжавых у сябе дома, ехалі дапамагаць суседзям. У той жа час, калі ў беларусаў былі праблемы з палівам, смаляне таксама падстаўлялі плячо. «Гэта значыць, як бы мы палітычна ні раз'ядноўваліся — разваліўся Савецкі Саюз, — людзі сцямілі, што трэба жыць разам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што гэта ўжо пяты візіт губернатара Смаленскай вобласці ў Беларусь. Гэта сведчыць аб тым, што і ў Смаленску разумеюць: мы павінны быць разам, развівацца, дапамагаць адно аднаму, асабліва ў гэтыя няпростыя часы. «І з любымі выклікамі і праблемамі мы справімся, калі будзем разам, — заявіў ён. — І хто б там, у Расіі, не вякаў, маўляў, «Лукашэнка, шматвектарнасць, зноў ён адпусціў гэтых палітвязняў некалькі дзясяткаў, значыць, ён ужо на Захад...» Слухайце, ну такое прымітыўнае мысленне, што далей няма куды. І мы гэта бачым і чуем. Так, у нас ёсць краіна. Наш галоўны знешнепалітычны пасыл і наша памкненне — з суседзямі трэба жыць у міры. Яны ад Бога». Прэзідэнт адзначыў, што беларусы стагоддзямі жылі разам з палякамі, і польскі народ не вінаваты, што іх урад цяпер займае такую брыдкую пазіцыю ў адносінах да Беларусі.

СТАР. 4

КОРАТКА

- **Каля 1200 фур чакаюць на граніцы ўезду ў ЕС.**
- З 15 красавіка 2022 года Беларусь наведалі больш за 1 млн жыхароў Еўропы.
- **У Мінску 19 і 20 лістапада адбудуцца спецыялізаваныя міні-кірмашы вакансій, арганізаваныя Камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**
- ААТ «Івацэвічдрэў» запусціла новую лінію ламініравання драўняна-стружкавых пліт (ДСП) уласнай вытворчасці.

ISSN 1990 — 763X

Спецыяльны рэпартаж

## НА АДНОЙ ХВАЛІ З БАБРУЙСКАМ

### Гасцінны, дружалюбны, квітнеючы горад на два дні стаў цэнтрам падзей маштабнай рэспубліканскай акцыі «Марафон адзінства»

**Свята было прадстаўлена шматлікай колькасцю пляцовак на вуліцах, прадпрыемствах, у навучальных установах. За гэтыя дні Бабруйск яшчэ больш згуртаваўся і папрыгажэў. На памяць аб марафоне засталіся маладзёжны арт-аб'ект, яркія фота і цёплыя ўражанні.**

### НЯлекцыі, танцы ў цэхах, шчырыя размовы

Яшчэ ў пятніцу Бабруйск адчуў, як марафон завітаў у горад і распаўсюдзіўся па яго вуліцах, заводах, навучальных установах. Навучэнцаў каледжаў захапіў фармат «НЯсумных НЯлекцый», дазволіў раскрыць сябе, пагутарыць з вядомымі спікерамі. Танцы ў цэхах буйных бабруйскіх прадпрыемстваў наогул сталі для працоўных прыемным узрушэннем. Калі нечакана рабочая пляцоўка ператвараецца ў канцэртную, а зоркі беларускай эстрады прыходзяць да цябе, пяюць з табой і танцуюць, гэта незабыўна. Настрою працаўнікам ФанДоку дадаў дырэктар Палаца Рэспублікі Максім Прыхадоўскі, які пад гукі Прэзідэнцкага аркестра «запальваў» у вальсе з супрацоўніцай завода. Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра адбыўся для завадчан у суботу. А напярэдадні сапраўдным падарункам для юных бабруйскіх талентаў з дзіцячай школы мастацтваў № 2 сталі жывыя ўзаемаадносіны з маладымі, але ўжо тытуляванымі салістамі гэтага аркестра, якія правялі для іх майстар-класы.

СТАР. 8–9



ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ — ГЭТА МОЦНАЯ КРАІНА! ГЭТА ЎЖО НЕ ТАКТЫКА —

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Самае галоўнае, у чым Гасподзь нас не пакрыўдзіў, ён нам даў мудрасць. Мудрасць заўсёды дапамагала нам зрабіць правільны выбар: самім вырашаць, як жыць, каму даверыць несці цяжар улады, што пакінуць нашым дзецям і ўнукам, — сказаў ён. — А працоўнае адзінства забяспечвае нам незалежнасць. Мы працуем і зарабляем. За кароткі гістарычны перыяд наша краіна стала самастойнай і самадастатковай дзяржавай. Гэта не раз нас ратавала».

Прэзідэнт падкрэсліў, што кожны рэгіён уносіць у засекі Радзімы нешта сваё. Як у сямейную скарбонку. «У нас жа сем «Я»: шэсць абласцей і Мінск. Усе працуюць на агульны вынік. Усе розныя, а сям'я адна. І адказнасць за яе таксама агульная», — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка вылучыў асаблівасць кожнай вобласці. Брэстчына — гэта любоў да тэхналогій. Таму ў вобласці самыя высокія паказчыкі па надоях малака. Віцебшчына паказвае, што такое сялянская кемлівасць. «Так, бальнасць глеб невысокая, ураджайнасць адпаведная. Але за кошт траў і нарыхтоўкі кармоў, стаўкі на жывёлагадоўлю рэгіён уносіць свой уклад у рэспубліканскі аграрны сектар», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Гомельшчына, па яго словах, дэманструе ўменне спраўляцца з цяжкасцямі. «Гродзеншчына — жаданне эксперыментаваць, смела ўкараняць навінкі, што дапамагае кожны год атрымліваць усё больш высокія ўраджаі. Міншчына — моцная гаспадарлівасць. Дастаткова паглядзець, што сёння там ужо пад тры мільёны намалоту па збожжавых, зернебабовых і алейных культурах. Мінск — сталіца, навуковы, прамысловы і перапрацоўчы цэнтр», — сказаў беларускі лідар.

### «Мы па праве ганарымся гісторыяй гэтага рэгіёна»

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і Магілёўшчына, якая завяршае «дажынкавую» эстафету, — рэгіён са сваёй разынкай. Тут амаль 700 рэк і азёр, уключаючы паўнаводныя і дзіўныя па прыгажосці Бярэзіну, Сож і Дняпро. Цудатворныя крыніцы, куды з'язджаюцца паломнікі. Зрабіў глыток — «як на свет нарадзіўся»! Вялізныя лясныя ўгоддзі. «У прамысловым маштабе вы асноўны ў краіне вытворца шын, ліфтаў, цэменту, хімічных валокнаў, газетнай паперы. Знакаміты бабруйскі зефір — ці не самы жаданы сувенір з Беларусі», — працягнуў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што ў суботу Бабруйск прыняў «Марафон адзінства». А праз тыдзень гэтая маштабная акцыя перамесціцца ў Магілёў.

«Мы па праве ганарымся гісторыяй гэтага рэгіёна. Менавіта ў Магілёве ў 1888 годзе з'явіўся першы беларускі тэатр. Яго сцэны памятаюць Шаляпіна і Рахманінава. Першы беларускі алімпійскі медаль заваяваў у Мельбурне ў 1956 годзе ўраджэнец Магілёўшчыны малатабоец Міхаіл Крываносаў», — прывёў яшчэ факты кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы пра сельскую гаспадарку, ён згадаў, што і першая ў Еўропе аграрная ВНУ — гэта Горы-Горацкая зямляробчая школа, якая расчыніла свае дзверы яшчэ ў 1840 годзе. «Дарэчы, менавіта там быў створаны першы ў свеце прататып збожжаўборачнага камбайна і закладзена першае ў свеце вучэбна-доследнае поле. Цяпер гэта Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках — флагман айчыннай аграрнай адукацыі. Кузня кадраў для ўсёй краіны. Абавязкова хуткім часам планую там пабываць. Ёсць пра што пагаварыць і з будучымі аграрыямі, і з тымі, хто адказвае за іх падрыхтоўку, і з маладымі спецыялістамі, паколькі для нас гэта найважнейшае пытанне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Прэзідэнт адзначыў і сёлетнія поспехі магілёўскага АПК. У гэтым годзе Магілёўская вобласць дала краіне 1 мільён 100 тысяч тон збожжавых і зернебабовых. Планку ў 100 тысяч перасягнуў Магілёўскі раён. Амаль 90 тысяч тон намалацілі ў Шклоўскім. Ураджайнасць 50—60 цэнтнераў з гектара атрымалі сельгасарганізацыі «Газавік-Сіпакова», «Рассвет імя К. П. Арлоўскага», «Агракамбінат «Зара», «Добраахвотнік» і іншыя. Добрая ўраджайнасць рапсу (амаль 34 цэнтнеры з гектара) у Кіраўскім раёне. А ў асобных гаспадарках гэтая лічба дасягае 50 цэнтнераў. «Цудоўна, ёсць на што раўняцца. Культура перспектыўная і грашовая», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ёсць перадавікі і ў нарыхтоўцы кармоў. Гэта «МушынаАгра», «Вендараж» і «Саўгас Кісялевічы». На зімова-стойлавы перыяд назапасілі ад 55 да 75 кармавых адзінак на ўмоўную галаву.

«Я кажу гэта для таго, каб вы разумелі, што ў нас ёсць на каго арыентавацца, і гэта бачылі. Паўтара мільёна намалоту па збожжавых і зернебабовых мы павінны дасягнуць і значна дадаць па малаку і мясе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў вобласці робяць стаўку на развіццё рыбаводства ў рэгіёне. «Вы ўзялі на сябе амбіцыйную задачу забяспечыць краіну каштоўнымі відамі рыб і прадукцыяй з іх, у тым ліку ікрой. Тады мы закрыем уласныя патрэбы, дадзім натуральны і гарантавана якасны прадукт для ўнутранага спажывання і на экспарт. Паспяхова вырашым яшчэ адну задачу па імпартазамяшчэнні», — адзначыў ён.

### «Патрэбны працоўныя месцы і замацаванне людзей на роднай зямлі»

Прэзідэнт запэўніў, што дзяржава заўсёды падставіць плячо сапраўдным працаўнікам. «Калі я буду бачыць, што ад таго ці іншага кірунку мы атрымаем добрую аддачу, прыбытак, гарантую вам усялякую падтрымку, у тым ліку фінансавую, — заявіў ён. — Таму, напрыклад, з 2015 года працуе праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. Ужо ўкладзена каля двух мільярдаў рублёў». Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што на гэтыя грошы зроблена нямала. Праведзена мадэрнізацыя цэментных заводаў. Іх перавялі на мясцовыя віды паліва. У Крычаўскім раёне пабудавалі завод цэментна-стружкавых пліт. У Слаўгарадскім раёне рэалізавалі інавацыйны праект па вытворчасці кандытарскіх выробаў, а таксама ўвялі ў строй свінагадоўчы комплекс на 24 тысячы галоў. У Клімавіцкім раёне цяпер ёсць найбуйнейшая ў вобласці племянная гаспадарка — рэпрадуктар на 3600 свінаматак.

«Дзеянне гэтай праграмы будзе працягнута, але ў абноўленым выглядзе. Яна стане тут на ўсходзе (яе разгледзім у найбліжэйшы час) стратэгічнай і будзе змяшчаць не толькі прэферэнцыі. Неабходна акрэсліць канкрэтныя новыя праекты, у тым ліку і, можа, найперш, прамысловай накіраванасці. Патрэбны працоўныя месцы і замацаванне людзей тут, на роднай зямлі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Па яго словах, у хуткім часе вызначыцца тактыка ў сельскай гаспадарцы.

«Асноўная задача — далейшае скарачэнне дыферэнцыяцыі ў сацыяльна-эканамічным развіцці тэрыторый. Моцныя рэгіёны — гэта моцная краіна! Гэтым шляхам мы будзем рухацца. Гэта ўжо не тактыка — гэта ўжо стратэгія», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што, наведваючы «Дажынкі», ён не толькі радаваўся поспехам кожнай вобласці, але і ўважліва вывучаў, што мы яшчэ можам зрабіць для людзей, як павысіць прывабнасць вёскі. «Каб чалавек ведаў: жыць у сельскай мясцовасці добра, выгадна і перспектыўна, — растлумачыў ён. — А ўвогуле, я вам скажу па-чалавечы, па-сялянску: нішто нас нідзе не чакае. Там, дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Давайце будзем ісці гэтым шляхам. Вы тут не толькі Клімавіцкі раён — усю паўднёва-ўсходнюю Беларусь можаце перавярнуць у добрым сэнсе слова і атрымаць добрыя ўраджаі. І памятайце (не хачу аб гэтым казаць, хоць гэта дакладна сказана): лепей на палях працаваць на трактары, чым ваяваць». Гэтыя словы кіраўніка дзяржавы людзі прывіталі апладысментамі.

### «Ні ў якім разе не згортваем праграму «Адзін раён — адзін праект»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што цяпер многія хочуць мець свой дом у вёсцы. «Гарадскі жыхар, які з'ехаў, хоча вярнуцца на свой кавалак зямлі 40—50 сотак, а можа, і больш. У неперспектыўных вёсках, аграгарадках такіх зямель хапае. Дай бог, каб іх распрацавалі і прывялі ў парадак», — сказаў ён. У той жа час кіраўнік дзяржавы акрэсліў яшчэ адну праблему — у краіне нямала пустых дамоў. Больш за тысячу з іх па ўсёй краіне ўжо прададзены ахвотным, 650 — за 1 базавую велічыню (40 рублёў). У рэестры — яшчэ 22 тысячы прапаноў. Прэзідэнт адзначыў, што трэба актыўна працягваць гэтую работу без цяганіны і бюракратызму. Ён згадаў часы, калі людзі імкнуліся набыць лішнюю сотку зямлі. Сёння тэндэнцыі змяніліся — людзі не гараць энтузіязмам павялічваць свае прысядзібныя ўчасткі. «Вялікая, неразумная памылка. Нішто не перашкаджае сёння за 40 рублёў купіць 40 сотак зямлі і стары дом. Не падабаецца — знасі, падабаецца — адрамантуй. Няхай будзе. Даглядай гэтыя 40 сотак, хто яго ведае, як жыццё ў нас складзецца. Мы ж беларусы. Усё можа быць. Гэты кавалак зямлі будзе заўсёды вас ратаваць. Будзе ўсё добра, як цяпер, дзякуй богу, унукі прыедуць, дзеці прыедуць. Летам, ранняй восенню, позняй вясной там пабудуць», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, працэс пайшоў, але вельмі марудна. Хутчэй нашы суседзі купляюць у нас участкі, чым беларусы.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на тое, што, прыцягваючы спецыялістаў на буйнатаварныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі, трэба даць ім арэнднае жыллё. «Галоўнае — гэта жыллё. Будзе дом для спецыяліста (без спецыялістаў немагчыма развіццё вёскі), будуць там дзеці, унукі, будзе там жыццё, і людзі будуць жыць на гэтай зямлі», — падкрэсліў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, неабходна даць спецыялістам магчымасць праз 15—20 гадоў выкупляць гэты дом ва ўласнасць.

Кіраўнік дзяржавы акрэсліў і яшчэ некаторыя важныя задачы: «Падцягнуць да самага высокага ўзроўню дарогі. У наступныя 2-3 гады мы гэта зробім. Вы чулі, да кожнага аграгарадка будзе аднаўлена, адрамантавана ці пабудавана (а такіх, мне дакладваюць, усяго крыху больш чым 300 кіламетраў). Мы гэта зробім за 2-3 гады. Гэта наша задача, дзяржавы задача. І не толькі дарогі — транспартнае забеспячэнне, крамы, фельчарска-акушэрскія пункты мы прывядзём у парадак у найбліжэйшыя два-тры гады. Мы створым прывабную інфраструктуру вольнага часу».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Жодзіне і Шклоўскім раёне запусцілі на эксперыментальныя маршруты электрааўтобусы. Па яго словах, такі праект будзе развівацца і ў іншых раёнах, паколькі гэта выгадны і перспектыўны напрамак.

«Таму ні ў якім разе не згортваем праграму «Адзін раён — адзін праект». Усяго за два гады рэалізавана 47 праектаў, створана больш за 4,5 тысячы працоўных месцаў, больш за тысячу з іх — на Магілёўшчыне. Гэта была мая ініцыятыва, і, як у народзе кажуць, я яе абавязкова дацісну, гэтую праграму. У Клімавічах, дапусцім, павінны быць створаны звычайныя невялікія, сярэднія — якія трэба для вас прадпрыемствы, дзе павінны працаваць людзі, замацоўвацца і жыць на гэтай зямлі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Калі шчыра, пакуль дадзеная праграма рэалізоўваецца не цалкам, як задумвалася. А яна на плячах старшынь райвыканкамаў. Частка праектаў — бягучая, планавая мадэрнізацыя прадпрыемстваў, якая б і так праводзілася. Іншымі словамі, прадпрыемства і без гэтай праграмы мадэрнізавалася б. Пад гэта хутка падстроіліся нашы начальнікі, чыноўнікі: «Вось мы там разгортваем». Не, дарагія мае, трэба ствараць новыя вытворчасці, няхай невялікія».

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад Копысь, на прыкладзе якога паказвалі, як павінны развівацца пасёлкі гарадскога тыпу. Кіраўнік дзяржавы ўспомніў, як раней там працаваў хлебазавод, а мясцовыя жыхары былі забяспечаны свежым хлебам, але яго закрылі. «А навошта закрылі? Няхай там тры, пяць чалавек працуе,

# ГЭТЫМ ШЛЯХАМ МЫ БУДЗЕМ РУХАЦЦА. ГЭТА ЎЖО СТРАТЭГІЯ»

але гэта нармальная вытворчасць, гэта ж для людзей, — абурыўся ён. — Вось адзін з прыкладаў. А ў гарадскім пасёлку Копысь беспрацоўных усяго 3—5 чалавек і яны б там працавалі. Іншымі словамі, трэба думаць спярша, чым нешта рабіць». Прэзідэнт згадаў, як раней у Шклоўскім раёне былі сельгастэхніка, сельгасхімія, ПМК будаўнічая, але ўсё закрылі. «Сёння мужна аднаўляем. Нібыта нам не патрэбна гэтая сельгастэхніка. А на якой базе вы будзеце гэтыя механізаваныя атрады трымаць? А людзі, якія там працавалі? Дзе мы моладзь будзем рыхтаваць па такіх спецыяльнасцях? — выказаўся ён. — Усё вырашылі закрыць. Навошта? Гэта задача старшынь райвыканкамаў. Усё гэта трэба аднавіць: ад камбікормавых заводаў да райаграсэрвісаў. І яны павінны рухацца, яны павінны працаваць, яны павінны прыносіць карысць сельскай гаспадарцы. Давайце гэта адновім, тое, што нам патрэбна».

Прэзідэнт паабяцаў, што ў наступнай пяцігодцы будзе ўзмоцнена праграма «Адзін раён — адзін праект» і патрабаванне за яе, асабліва на ўзроўні старшынь райвыканкамаў. «Літаральна праз некалькі дзён у мяне разгледзім вынікі гэтай праграмы, паглядзім, як вы гэта зрабілі. Але папярэджваю: не хлусіце, крый бог. Не рабіце выгляд, што вы чагосьці зрабілі, калі вы гэтага не зрабілі. Непапулярна перад прэзідэнцкімі выбарамі, але вы мой падыход ведаеце. Дамовіліся — трэба рабіць. Кроў з носа — трэба зрабіць», — папярэдзіў усіх адказных кіраўнік дзяржавы.

## «Тэма развіцця рэгіёнаў павінна чырвонай ніткай праходзіць праз усю будучую пяцігодку»

Цяпер задача № 1, па словах беларускага лідара, — не дапускаць адтоку эканамічна актыўнага насельніцтва з раёнаў. «Трэба даць людзям працу. Не проста працу, а цікавую працу. Зрабіць гэта можна толькі праз новыя вытворчасці і сур'ёзны пад'ём якасці жыцця людзей. Каб у чалавека разам з заробкам расла матывацыя і кваліфікацыя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Але, давайце шчыра казаць, у нас усе жадаюць працаваць як найлепшыя? Далёка не ўсе. Рыхтуйцеся! Бамжоў і дармаедаў у краіне не будзе. Усе павінны рухацца, працаваць, зарабляць на сябе і на сваю сям'ю. Мы дапаможам, дадзім працоўнае месца, толькі ідзіце і працуйце. Тыя, хто перашкаджае людзям жыць, мы з вамі будзем сур'ёзна разбірацца, не крыўдзіцеся».

Прэзідэнт падкрэсліў, што мясцовыя ўлады павінны стварыць рэжым максімальнага спрыяння для ўсіх адказных інвестараў. «Калі чалавек хоча ўкласці капейку ў вытворчасць, асабліва ў вытворчасць, дапамажыце яму. Вызначыцеся, дзе вам патрэбна гэтая капейка, але не пускайце іх па кругу. Чалавек дасведчаны і кваліфікаваны, які прыйшоў са сваімі грашамі ці ўзяў крэдыты, дапамажыце яму стварыць вытворчасць, там жа будуць працаваць людзі, — сказаў ён. — Усе гэтыя захады ў той ці іншай ступені ёсць, але яны разрозненыя, разгрупаваныя па розных дакументах. Рашэнні прыняты. Іх трэба аб'яднаць, актуалізаваць і зрабіць прыярытэтным нацыянальным праектам». Аляксандр Лукашэнка расказаў, што адпаведнае даручэнне дадзена юрыстам. Перад адказнымі асобамі стаіць мэта прывесці заканадаўства ў ідэальны стан, каб чалавек не кідаўся па розных нарматыўна-прававых актах і не шукаў, як гэта арганізаваць. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што спецыялісты праводзяць для гэтага вялікую працу і ў наступным годзе яна будзе скончана.

«Тэма развіцця рэгіёнаў павінна чырвонай ніткай праходзіць праз усю будучую пяцігодку. Менавіта раёны, рэгіёны, вобласці — на іх будзе зроблены ўпор. Мы не павінны сцягваць людзей у цэнтр краіны, Мінск і ваколіцы. Людзі павінны жыць па ўсёй краіне», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што краіна прайшла вялікі шлях па стварэнні АПК будучыні. Але наперадзе задач не менш. «Павышаць прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі перш за ўсё за кошт тэхналагічнай дысцыпліны і дакладнага земляробства. Павялічваць глыбіню перапрацоўкі. Развіваць уласную насенную базу, балазе навуковых інстытутаў у нас хапае», — пералічыў асноўныя з гэтых задач беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што прыехаў у Клімавічы найперш для таго, каб паглядзець, як людзі працуюць на зямлі. Тым больш з борта верталёта ўсё відаць. Сваю ацэнку ўбачанага Аляксандр Лукашэнка агучыў з трыбуны: «Я не скажу, што добра, ні ў якім выпадку. Не скажу, што дрэнна. Але нашмат лепей, чым у мінулыя гады. Вы ўжо падрыхтаваліся ў земляробстве, як ніколі раней. Ужо палі вызвалены ад саломы, салома складзена (ёсць пару палёў літаральна, гэта трэба са старшынёй райвыканкама разбірацца, чаму так адбываецца). Але ўсё больш-менш у парадак прывялі». Разам з тым, па словах беларускага лідара, Магілёўская вобласць адстае ад заходніх абласцей, да якіх таксама ёсць заўвагі, але якія выпраўляюцца больш хутка. «Лепей на зямлі працаваць, чым потым карачыцца. Будзе эканоміка — вайны ніколі не будзе. Не будзе эканомікі — самі спародзім гэту вайну, грамадзянскую развяжам. А ахвотных хапае: яны за мяжой ходзяць, бразгаюць зброяй. Але баяцца, таму што адзіныя мы як ніколі, таму што мы жыць жадаем на сваёй зямлі. Яны гэтага баяцца найперш, а не таму, што бацька там з дубінай ходзіць. Яны баяцца нашага адзінства і таго, што мы жадаем працаваць. Страцім гэтае пачуццё — паглядзіце, што будзе. Не дай бог гэтага дапусціць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Вяртаючыся да АПК, Прэзідэнт падкрэсліў, што яго ўзровень — гэта комплексны харчовы шчыт для сябе і экспартны каталізатар. Па яго словах, тое, што беларускія аграрыі могуць дасягаць выніку, паказвае і сёлетняя ўборачная кампанія. Ён прывёў лічбы. Атрымана па краіне 10,3 мільёна тон збожжа ўсіх відаў. Агульная лічба вышэй за зададзеную планку — адна тона збожжа на аднаго жыхара краіны. «Гэта норма міжнародная. Калі дзяржава вырабляе збожжа больш за адну тону на чалавека, гэта перспектыўная дзяржава, мы сёлета зрабілі гэта», — адзначыў беларускі лідар.

Сабрана пяць мільёнаў тон цукровых буракоў, 150 тысяч тон ільнотрасты, нарыхтавана дзевяць з паловай мільёнаў тон кармоў рознага віду. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як вырошчванне цукровых буракоў дапамагло вырашыць праблему з дэфіцытам цукру ў краіне. «Мы самі можам вырашыць усе праблемы, якія ў нас ёсць», — канстатаваў ён.

Чакаецца, што па выніках года надой малака ад адной каровы перавысіць шэсць тысяч кілаграмаў. Прэзідэнт згадаў часы, калі чатыры тысячы кілаграмаў былі подзвігам. А сёння плануецца выйсці на сем тысяч. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што гэта цалкам магчыма, але пры ўмове, што будзе вырашана праблема з падзяжом жывёлы, актуальная і для Магілёўскай вобласці.

«І ўсяго таго добрага, што ў нас ёсць, вяскоўцы дабіліся ва ўмовах жорсткай барацьбы з засухай і ўраганнымі вятрамі, якія накрылі асабліва Гомельскую, Магілёўскую вобласці і частку Мінскай, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У наступнай пяцігодцы ад вяскоўцаў ізноў чакаюць подзвігаў. Устойліва выйсці на 10,5—11 мільёнаў тон збожжа, 11 мільёнаў, больш не прашу». Таксама, па словах Прэзідэнта, у наступнай пяцігодцы неабходна перавесці ўсю жывёлу ў сучасныя комплексы і павялічыць надоі да 7-8 тон ад каровы. «Малочнатаварныя комплексы ў наступнай пяцігодцы будуць пабудаваны па ўсёй краіне. Трымаць карову ў загашніках мы не можам, карова павінна быць у палацы. І не толькі таму, што гэта наша ратаванне», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, карове варта паставіць помнік, паколькі гэтая жывёла ратавала жыцці людзям нават у самыя складаныя ваенныя часы. Ды і ад каровы, ад якасці малака і малочных прадуктаў залежыць здароўе людзей. Прэзідэнт заявіў, што за наступную пяцігодку неабходна пабудаваць ультрасучасныя свінакомплексы, канчаткова разабрацца з перапрацоўкай лёну. Ён растлумачыў, чаму так хвалюецца за гэты кірунак: «Лён — гэта будучыня. Не таму, што гэта сімвал нашай краіны і ў нашым гербе лён. Вы бачыце — цэны пачалі расці. Людзі ўсё больш і больш да натуральных тканін схіляюцца. Акрамя беларусаў. Беларусы не разумеюць. Беларусы рвуцца за Gucci, Versace і іншай гадасцю. Сваё трэба насіць. Свае тканіны. У нас ёсць усё. Насіце сваё і прывучайце дзяцей да гэтага», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка. Таксама, па яго словах, трэба забяспечыць Беларусь сваёй гароднінай, садавінай і рыбай па даступных цэнах, укараніць новыя культуры (соі, тэхнічныя каноплі) і самабытныя прадукты. «У гэтым кірунку трэба рухацца смялей», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ў нашай краіне ёсць усё, каб развіваць садаводства. І зямлі для гэтага цалкам хапае.

«Наша задача — экспарт у аб'ёме не менш як 10 мільярдаў долараў за год з акцэнтам на новыя рынкі. А новыя рынкі — гэта Афрыка і Азія. Вы не думайце, што нам Захад санкцыі ўвёў, бо ў нас правоў чалавека няма і іншае. Аб гэтым ужо ўсе забыліся. Мы для іх канкурэнты. Наша прадукцыя там не патрэбна. Здаецца, ваюючы з Украінай — дапамагаюць і іншае. Але як толькі ўкраінцы праз Польшчу і іншыя краіны пачалі вывозіць збожжа, у тую ж Афрыку, не ім, яны закрылі гэтыя дарогі. Чаму? Гэта ж сябры, абяцалі дапамагчы. А таму што збожжа — гэта канкурэнт для Заходняй Еўропы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што беларуская прадукцыя вельмі патрэбна Афрыцы, і адзін з прыкладаў таму — Зімбабвэ. Зацікаўлены ў супрацоўніцтве з беларускімі партнёрамі і краіны Азіі. Заўсёды запатрабавана беларуская прадукцыя ў Расіі.

«8-9 мільярдаў долараў у гэтым годзе мы можам атрымаць ад экспарту. Нафтавікі столькі не атрымліваюць. А трэба 10 мільярдаў — адзін мільярд застаўся. Мы павінны ў наступнай пяцігодцы падысці да гэтага ўзроўню, — арыентуе беларускі лідар. — Будзе нялёгка. Але зразумейце, інакш дабіцца выніку немагчыма. Толькі цяжкая праца, пот і максімальнае напружанне могуць нам дапамагчы». Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ахвотных парваць Беларусь шмат. «Як толькі расслабімся і самазаспакоімся — знікнем з палітычнай карты свету, — заявіў ён. — Як ужо казаў, у наступныя пяць гадоў адшліфуем краіну і прывязём яе ў ідэальны стан, каб перадаць нашым дзецям. Тыя перадавікі жніва, якія тут прысутнічаюць, павінны дапамагчы гаспадаркам, якія адстаюць». Прэзідэнт заўважыў, што ў кожным раёне ёсць гаспадаркі, на якія можна і трэба раўняцца. І тут, па яго словах, на поўную моц трэба задзейнічаць старшынь райвыканкамаў.

## «Я вельмі ганаруся вамі. Вельмі»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на гербе і сцягу Клімавічаў адлюстравана залатая пчала — знакавы сімвал працавітасці мясцовых жыхароў. «Так, у нашай краіне няма столькі, колькі нам трэба, нафты і газу. Але ёсць свой кавалак зямлі. І ёсць унікальныя людзі. Гэта я вам кажу не таму, што вы перад мной. Не стамляюся паўтараць: гэта галоўнае наша багацце, тое, чаго няма ў іншых краін», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што ў наступныя гады абавязкова будуць новыя імёны, якія будуць увасабляць чарговыя поспехі і рэкорды, як тыя людзі, якія атрымалі ўзнагароды з рук Прэзідэнта.

«Я вельмі ганаруся ўсімі вамі. Вельмі», — прызнаўся беларускі лідар. Па яго словах, вялікі здабытак Прэзідэнта, калі да яго народа ніхто не можа прад'явіць прэтэнзій. «Вы — мой гонар. Я шчаслівы, што нарадзіўся і вырас на гэтай зямлі разам з вамі. І ўдзячны лёсу за тое, што час выбраў менавіта нас. Цяжкі час, але мы гэты час рабілі. І мы яго зробім так, як нам патрэбна. І нашы важныя старонкі гісторыі суверэннай Беларусі мы пішам разам з вамі. Без ілжывай сціпласці — мы гэта робім годна!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт павіншаваў са святам усіх працаўнікоў вёскі, самых стойкіх, патрыятычных, мудрых: «Гэта ўсё вы. Вы аплот наш. Гэта вы не дапусцілі знішчэння і развалу нашай краіны. Жадаю ўсім здароўя, дабрабыту і новых здзяйсненняў. І ў кожную хату, кожную сям'ю — любові, паразумення і дастатку, які залежыць толькі ад нас».

## «Будзеце вы — будзе і краіна»

Па святочнай традыцыі «Дажынак» Прэзідэнт уручыў найлепшым працаўнікам вёскі заслужаныя ўзнагароды. Ордэна Пашаны ўдастоены трактарыст-машыніст ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Мікалай Дрозд. Дарэчы, ён прадстаўнік працоўнай дынастыі. Агульны стаж сям'і Дрозд складае 220 гадоў. Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны: загрузчык сыравіны ААТ «Гаркілен» Святлана Зэйдзіна, дырэктар ААТ «Кіраўскі райаграпрамтэхзаб» Лявонцій Кушавараў, вядучы спецыяліст па вырошчванні ААТ «Мсціслаўлён» Міхаіл Лорчанка, дырэктар — галоўны дзяржаўны інспектар Магілёўскай абласной дзяржаўнай інспекцыі па насенняводстве, каранціне і абароне раслін Сяргей Марфель, галоўны інжынер сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Гігант» Ігар Міхалёнак; трактарыст-машыніст ААТ «Александрыйскае» Аляксандр Якуцін.

Ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена трактарысту-машыністу камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Ніва-Барсукі» Аляксандру Петранкову. Шэраг работнікаў АПК удастоены Падзякі Прэзідэнта. Падзякі Прэзідэнта ўдастоены таксама калектыў унітарнага камунальнага сельгаспрадпрыемства «Саўгас «Добраахвотнік». Прадстаўнікам працоўнага калектыву гэтага прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка ўручыў падарункавы сертыфікат на трактар «Беларус».

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі — гэта чалавек, які шануе сялянскую працу, ведае цану гэтай працы, дапамагае і засцерагае людзей, якія працуюць у галіне. У падзяку за гэта кіраўніку дзяржавы паднеслі жытніцу ўраджаю 2024 года. Яшчэ адзін падарунак — сімвалічны, звязаны з самым каштоўным, што ёсць у вобласці і пра што казаў у сваім выступленні Прэзідэнт. Аляксандру Лукашэнку ўручылі фотаальбом «Соль зямлі Магілёўскай», у ім сабраны фотаздымкі людзей, якія кожны дзень самаадданай працай праслаўляюць родную зямлю, захоўваюць і прымнажаюць найлепшыя аграрныя традыцыі краіны. Дарэчы, кіраўніку дзяржавы перадалі два фотаальбомы. Але Анатоль Ісачанка адзін папрасіў вярнуць з аўтографам Прэзідэнта, каб пакінуць яго ў музеі Клімавіцкага раёна. «Першы губернатар, які просіць аўтограф, а не грошы», — пажартаваў кіраўнік дзяржавы.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падзякаваў работнікам АПК за працу. «Галоўнае — гэта вы. Будзеце вы — будзе і краіна, з хлебам будзем, усё ў нас будзе: і мір, і спакой. Шчасця вам, поспехаў, жывіце доўга, будзьце здаровыя! У нас ёсць усё. Тое, чаго няма, мы купім», — сказаў на развітанне Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*г. Клімавічы.*

# «У НАС АГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ, АГУЛЬНАЕ ЦЯПЕРАШНЯЕ. І Я ПЕРАКАНАНЫ, ШТО БУДУЧЫНЯ Ў НАС ПАВІННА БЫЦЬ АГУЛЬНАЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Хіба палякі ў гэтым вінаватыя? У нейкай ступені так, яны ж выбіраюць іх. Але ў большасці сваёй палякі жадаюць жыць мірна з намі. Тое ж самае літоўцы, латышы, украінцы. Але калі такую палітыку праводзіць кіраўніцтва... Таму мы спакойна, мэтанакіравана спрабуем выбудоўваць з імі адносіны. Але інтарэсы нашы, яны ёсць нашы інтарэсы. Так і з Расіяй выбудоўваем адносіны. Але Расія коса на нас не глядзіць, гадасцяў ніякіх нам не робіць, наадварот, падтрымлівае ў самыя цяжкія і складаныя часы. Натуральна, і мы адпаведна да гэтага падыходзім і ставімся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ні разу не чуў ад Прэзідэнта Расіі, што Беларусь і Расія павінны жыць адзінай дзяржавай. Па яго словах, у гэтым няма ніякай неабходнасці. Тым больш, паводле слоў беларускага лідара, супрацоўніцтва Беларусі і Расіі больш цеснае, чым калі б жылі ў адной дзяржаве. «Нам і трэба, каб мы былі адзіныя і каб нас ніхто рознымі абяцаннямі не мог расцягнуць у розныя бакі, як гэта было пасля распаду Савецкага Саюза, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Таму ў нас тут усё вызначана ў палітыцы і дыпламатыі. На гэтым заснавана наша эканоміка. І эканоміка з'яўляецца падмуркам і базісам нашых адносін. Ад гэтага нікуды не падзецца, гэта жыццё людзей. І мы гэта выдатна разумеем».

## Няма ніякіх праблем, каб нам супрацоўнічаць. Але трэба ўключаць дадатковыя хуткасці

Тавараабарот Беларусі і Смаленскай вобласці ў 2023 годзе склаў 4,4 млрд долараў. У студзені — верасні 2024 года ўзаемны гандаль склаўся ў памеры 3,1 млрд долараў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Смаленская вобласць для Беларусі — вароты ў вялікую Расію: «І гэта нармальна, мы з гэтым згодны». Паводле слоў беларускага лідара, тры прыгранічныя вобласці — Смаленская, Бранская і Пскоўская — павінны быць вельмі цесна звязаны з Беларуссю. І ў цэлым беларусы па асобных кірунках працуюць па ўсёй Расіі. «Але аснова — гэта нашы суседзі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, неабходна разабрацца з прычынамі, па якіх тавараабарот падае, і напружыцца, каб дасягнуць узроўню ў пяць мільярдаў долараў. Прэзідэнт вылучыў кірункі, па якіх трэба больш працаваць для дасягнення гэтых мэт.

**Стварэнне сэрвісных цэнтраў МАЗ.** «Я не бачу праблем, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба ствараць там сэрвісныя цэнтры. У адваротным выпадку навошта ім нашы МАЗы, калі мы не можам іх абслугоўваць. Хаця Беларусь побач, мы заўсёды падстрахуем, але трэба, каб і там была гэтая пляцоўка».

**Абнаўленне парка пасажырскай тэхнікі.** Кіраўнік дзяржавы зазначыў, што за апошнія два гады пастаўлена 55 аўтобусаў МАЗ. Актуальнае пытанне і пастаўка электратранспарту. «Гэта будучыня. Смаляне, як і беларусы, будуць проста вымушаны гэтым займацца. У нас ёсць пэўныя кампетэнцыі. Трэба працаваць разам, калі гаворым, што мы заадно павінны працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Яшчэ адзін кірунак — **пастаўкі дарожна-камунальнай тэхнікі.** «Побач, пад бокам мы вырабляем — навошта дзесьці нечага шукаць? Трэба дамаўляцца і пастаўляць. Ну, і абслугоўваць трэба. Калі мы мазаўскі сэрвіс там ствараем, трэба, каб і іншая тэхніка там абслугоўвалася. Трэба, каб быў цэнтр. Смаленская вобласць жа не гіганцкая, кампактная, трэба, каб гэты цэнтр там быў», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Не менш перспектыўны кірунак — **зборачныя вытворчасці «Бабруйскаграмаш» і Мотавелазавода.** Паводле слоў Прэзідэнта, смалянам гэта патрэбна, а беларусам выгадна. Тым больш, як ён заўважыў, сельгастэхніка Смаленскай вобласці заўсёды будзе патрэбна. Рэгіён актыўна займаецца меліярацыяй, таксама як і Беларусь. «Мы некалі гэтым заняліся і высветлілі, што з савецкіх часоў тэхніку гэту дабілі, кінулі і распусцілі МПК, былі такія меліярацыйныя перасоўныя калоны. Вымушаны былі ўзнавіць. Меліярацыяй мы з вамі заўсёды будзем займацца, у нас землі такія. Мы прайшлі гэты шлях, аднавілі тэхніку: і бульдозеры, і экскаватары, і дрэнаўкладчыкі. Зусім побач, пад Оршай, — прадпрыемства «Амкадор». Калі трэба вопыт, дапамога недзе, каб з чагосьці пачаць, — мы гатовы вам аказаць пасільную адпаведную дапамогу», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Таксама ён прапанаваў супрацоўніцтва і па **пастаўцы пажарных машын,** якія заўсёды патрэбны. Гэту тэхніку беларускай вытворчасці ўжо купляюць Зімбабвэ, В'етнам, Кітай і іншыя краіны.

«Калі вы вырашыце будаваць недзе дарогі, мы можам уключыцца. Жадаеце пад ключ, жадаеце на субпадрадзе — як захочаце, калі вам гэта трэба будзе. Дарожная тэхніка — поўны комплекс мы ў Беларусі вырабляем», — працягнуў Прэзідэнт.

Яшчэ адно актуальнае пытанне — **станкабудаванне.** Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, многія расійскія рэгіёны зацікаўлены ў супрацоўніцтве з беларускімі партнёрамі па гэтым кірунку. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў савецкі час беларускія прадпрыемствы выпускалі ідэальныя для свайго часу станкі, потым адбыўся невялікі спад, але за апошнія гады ў краіне нямала зроблена для аднаўлення станкабудавання. «Разам з мікраэлектронікай гэтае пытанне таксама з Прэзідэнтам Расіі абмяркоўвалі, станкабудаванне — пытанне нумар адзін для Беларусі і Расіі. Запатрабаванасць Беларусі каласальная ў Расіі. Каму, як не смалянам, калі гэта трэба будзе, мы гатовы дапамагчы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што мікраэлектроніка і станкабудаванне з савецкіх часоў было беларускай тэмай, і мы маем тут поспех і нават у нечым апярэджваем расійскія рэгіёны. Тым больш, як заўважыў Прэзідэнт, у гандлі Беларусі і Смаленскай вобласці ніколі не было ніякіх праблем і перашкод.

«Я чалавек, можна так сказаць, смаленскі, паколькі Орша і Смаленск — гэта непадзельныя землі былі. Мы заўсёды сябравалі і супрацоўнічалі адзін з адным, — зрабіў акцэнт беларускі лідар. — Таму для мяне ваш рэгіён блізкі і вельмі знаёмы. Але для таго, каб усё было нармальна, трэба забяспечыць свабоду перамяшчэння людзям. Калі мне кажуць, што недзе там на граніцы са Смаленскай вобласцю нехта кагосьці правярае, затрымлівае — мне дрэнна становіцца. Ну што мы правяраем адзін аднаго? Ды калі трэба камусьці абысці нашы пасты, яны тысячу разоў аб'едуць. Яны ведаюць гэтыя ўсе сцежкі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі не перашкаджаюць цесным зносінам і паездкам грамадзян дзвюх дзяржаў. «Мы гэтаму не перашкаджаем. Няхай людзі едуць, куды яны хочуць, — у Смаленскую вобласць. І, наадварот, мы нават не ведаем, хто прыязджае са Смаленскай вобласці. Таму нам тармазіць у гэтым плане людзей ні ў якім разе не трэба. Гэта вельмі важна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён прызнаўся, што вельмі рады, калі смаляне купляюць беларускую прадукцыю і вязуць яе да сябе дадому ў вялікай колькасці. Па яго словах, людзей падкупляе якасць прадукцыі і кошт. «Няма ніякіх праблем, каб нам супрацоўнічаць. Проста трэба не перашкаджаць людзям, а падтрымліваць, — рэзюмаваў Прэзідэнт. — Тармажэння ў нас ніякага няма і не будзе з боку Беларусі. Але хутчэй... Час такі цяпер, што трэба ўключаць дадатковыя хуткасці, каб нас не затапталі і не растапталі. Мы да гэтага гатовыя». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што з Прэзідэнтам Расіі ў іх па гэтым пытанні поўнае ўзаемаразуменне.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларусам ёсць чаму павучыцца ў смалян. Напрыклад, культуры, духоўнасці. І шмат да гэтага ўжо робіцца. «Калі вас нешта ў нас цікавіць, ведайце, што мы заўсёды гатовыя падставіць плячо, нават на школу камусьці і нават на школу ўласным інтарэсам, калі гэта будзе трэба. Так і будзем дзейнічаць у далейшым», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## «У НАС ШМАТ КААПЕРАЦЫЙНЫХ СУВЯЗЯЎ. ІХ ТРЭБА ЎМАЦОЎВАЦЬ...»

Васіль Анохін падзякаваў беларускаму лідару за ўвагу да прыгранічных сфер і супрацоўніцтва з імі. Ён адзначыў высокі ўзровень кантактаў са сваім беларускім калегам, губернатарам Віцебскай вобласці Аляксандрам Субоцкім. Паводле слоў Васіля Анохіна, яны наладжваюць свае зносіны на прыкладзе адносін лідараў дзвюх краін. «Вы правільна сказалі, што нашы народы маюць агульную гісторыю, культурныя каштоўнасці і нам гэта трэба захоўваць. Беларусь заўсёды сардэчна нас сустракае», — адзначыў губернатар Смаленскай вобласці. Ён расказаў, што прадстаўнікі рэгіёна актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Беларусі: Форум рэгіёнаў, «Славянскі базар», турыстычная выстава-кірмаш «Адпачынак» і іншых. Гэтак жа сама і беларускія прадстаўнікі пастаянна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах Смаленшчыны.

Журналістам Васіль Анохін расказаў, што гэты візіт вельмі важны для Смаленскай вобласці, для жыхароў рэгіёна, у якім кожная трэцяя сям'я мае сваякоў у Беларусі. Ключавым напрамкам, у якім найбольш зацікаўлены бакі, ён назваў узаемадзеянне ў прамысловасці. «У нас шмат кааперацыйных сувязяў. Іх трэба ўмацоўваць і выбудоўваць моцныя кааперацыйныя сувязі па вытворчасці прадукцыі», — падкрэсліў губернатар Смаленскай вобласці. Паводле яго слоў, стварэнне сэрвіснага цэнтра МАЗ, пра які казаў Аляксандр Лукашэнка, бачыцца вельмі важным праектам для Смаленскай вобласці. Васіль Анохін паведаміў, што за папярэднія паўтара года для патрэб вобласці было набыта каля 55 аўтобусаў, а таксама каля 60 адзінак дарожнай тэхнікі МАЗ. «Таксама абмяркавалі рэалізацыю праекта ў галіне сельгасмашынабудавання сумесна з прадпрыемствам «Бабруйскаграмаш». Гэта таксама значна, важна, нашы аграрыі выкарыстоўваюць больш як 70 працэнтаў тэхнікі беларускай вытворчасці», — праінфармаваў Васіль Анохін. Акрамя таго, бакі абмеркавалі магчымасць рэалізацыі сумеснага праекта з «Белкамунмашам» па абнаўленні трамваяў. Губернатар расказаў, што Смаленская вобласць зацікаўлена ў беларускай тэхналогіі па рэнавацыі трамвая, што дасць магчымасць зрабіць працэс значна больш танным. Гэта пытанне актуальнае і для іншых расійскіх рэгіёнаў.




Перспектыўны кірунак супрацоўніцтва — сельская гаспадарка. Па словах Васіля Анохіна, узаемны гандаль у сферы АПК ужо перавысіў планку ў 50 млрд расійскіх рублёў і працягвае расці. Губернатар расказаў, што вытворцы Смаленскай вобласці актыўна ўзаемадзейнічаюць з Аршанскім ільнокамбінатам, з Інстытутам лёну. На сустрэчы з Прэзідэнтам абмяркоўвалася магчымасць стварэння сумеснага селекцыйна-насенняводчага цэнтра паміж Інстытутам лёну (Аршанскі раён) і Смаленскай сельгасакадэміяй, што дасць магчымасць спрасціць доступ расійскіх аграрыяў да насення беларускай вытворчасці.

# «Пенсіённы» бюджэт, інклюзія ў адукацыі, змяненні ў рэгістрацыі нерухомасці

**На пасяджэнні другой сесіі Савета Рэспублікі восьмага склікання быў разгледжаны шэраг важных законапраектаў**



Фота БелТА.

У прыватнасці, праект закона **«Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2025 год»,** адобраны сенатарамі, вызначае крыніцы фарміравання даходаў бюджэту фонду, іх аб'ём і парамкі выкарыстання сродкаў фонду, устанаўлівае парадак выканання бюджэту фонду.

Даходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 32 775,6 млн рублёў, выдаткі — 32 273,8 млн рублёў, прафіцыт — 501,8 млн рублёў. Асноўная частка даходаў (92,3 працэнта) будзе фарміравацца за кошт узносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, якія прадстаўлены абавязковымі страхавымі ўзносамі і ўзносамі на прафесійнае пенсіённае страхаванне.

Расходы бюджэту фонду запланаваны ў памеры 32 273,8 млн рублёў. Асноўная сума расходаў прадугледжваецца на фінансаванне пенсіённага забеспячэння грамадзян і на выплату дапамог. Фінансаванне па іншых артыкулах расходаў запланавана ў адпаведнасці з мэтавым назначэннем сродкаў фонду.

Праект закона **«Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адукацыі»** падрыхтаваны з улікам правапрымяняльнай практыкі ў мэтах удакладнення асобных норм Кодэкса аб адукацыі. У прыватнасці, прадугледжваюцца гарантыі маладым спецыялістам, звольненым з працы ў сувязі з прызывам на ваенную службу, але не накіраваным для яе праходжання, на займанне ранейшай пасады.

Мясцовыя органы ўлады надзяляюцца паўнамоцтвамі па арганізацыі бясплатнай перавозкі навучэнцаў у межах буйных населеных пунктаў да ўстаноў адукацыі і да месцаў правядзення адукацыйных, спартыўных, культурных і іншых мерапрыемстваў (цяпер прадугледжаны падвоз толькі ў сельскіх населеных пунктах да ўстаноў дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі).

Даецца магчымасць асваення вучнямі X—XI класаў адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын. Ураду дадзены паўнамоцтвы па вызначэнні ў Кодэксе выпадкаў пераразмеркавання і перанакіравання на работу маладых спецыялістаў (напрыклад, іх перанакіраванне на службу ў МУС, Следчы камітэт, Мытны камітэт).

У мэтах узмацнення адказнасці заказчыкаў мэтавай падрыхтоўкі прадугледжваецца абавязак арганізацыі — заказчыка кадраў кампенсаваць сродкі, затрачаныя дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста, у выпадку неабгрунтаванага скасавання або невыканання ўмоў дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы.

Прадугледжваецца вызваленне выпускнікоў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ад кампенсацыі затрачаных дзяржавай сродкаў пры немагчымасці выдзялення ім новага месца работы пры пераразмеркаванні ў населеных пунктах па месцы жыхарства або па месцы ўключэння іх у спісы ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Выключаецца права рэалізацыі індывідуальнымі прадпрымальнікамі адукацыйных праграм дашкольнай і спецыяльнай адукацыі. Замацавана патрабаванне да навучэнцаў школ прытрымлівацца дзелавога стылю ў адзенні.

Каментуючы навацыі праекта закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адукацыі», **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ** адзначыў, што яны накіраваны на пашырэнне правоў і магчымасцяў навучэнцаў у атрыманні якаснай адукацыі ў нашай краіне.

«Гэта дастаткова знакавы законапраект, па якім праходзіла шырокае абмеркаванне і ў Палаце прадстаўнікоў пры падрыхтоўцы да першага і другога чытанняў, і ў экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі, — адзначыў парламентарый. — На пасяджэнні экспертнага савета быў выказаны шэраг ключавых момантаў і прапаноў, якія ў далейшым знайшлі сваё адлюстраванне ў дадзеным праекце закона, у першую чаргу з пункту гледжання пашырэння сацыяльных гарантый для навучэнцаў».

У ліку такіх гарантый: права на атрыманне лагапедычнай дапамогі дзецям з расстройствам аўтыстычнага спектра; пашырэнне пераліку суб'ектаў, якія маюць права на пераважнае накіраванне ў санаторныя школы-інтэрнаты, а таксама шэраг іншых сацыяльных прэферэнцый і льгот.

Прынцып інклюзіўнай адукацыі з'яўляецца ключавым у Кодэксе аб адукацыі, заўважыў Сяргей Сівец: «Законапраектам мы паляпшаем сацыяльнае становішча тых, хто на сёння атрымлівае адукацыю ў нашай краіне, і даём пэўныя магчымасці асобным катэгорыям, якім патрабуецца дадатковая апека, патэрны з боку дзяржавы ў атрыманні адукацыі з улікам асаблівасцяў развіцця».

Праект закона **«Аб каштоўных металах і каштоўных камянях»** прадугледжвае сістэмную карэкціроўку дзеючага панящійнага апарату і ўвядзенне новых тэрмінаў («іменнік», «апрацоўка каштоўных камянёў», «апрацоўка (перапрацоўка) лому і адходаў каштоўных металаў» і іншых). Удакладняюцца паўнамоцтвы Міністэрства фінансаў, якое з'яўляецца рэгулятарам у сферы дзейнасці з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі, Нацыянальнага банка і іншых дзяржаўных органаў.

Прадугледжваецца далейшае спрашчэнне аперацый з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі шляхам пашырэння пераліку камплектуючых, вузлоў і дэталяў абсталявання, прыбораў і іншых вырабаў, з якіх атрыманне каштоўных металаў немэтазгодна, за кошт абсталявання, што знаходзіцца ў замежных установах (камп'ютары, прынтары, іншая бытавая і электронна-вылічальная тэхніка), а таксама шляхам вызначэння відаў маёмасці, якая можа перадавацца або рэалізоўвацца без уліку кошту каштоўных металаў і каштоўных камянёў, змешчаных у ёй.

Адобраны сенатарамі праект **«Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй»** прадугледжвае абавязковую дзяржаўную рэгістрацыю прыналежных фізічным асобам аб'ектаў нерухомасці і тэрмін, на працягу якога неабходна звярнуцца па іх рэгістрацыю; магчымасць здзяйснення рэгістрацыйных дзеянняў не па месцы знаходжання аб'екта нерухомасці, а таксама магчымасць пасведчання здзелкі двума і больш рэгістратарамі; неабходнасць унясення ў рэгістр нерухомасці звестак аб наяўнасці зямельнай спрэчкі; удакладненне кваліфікацыйных патрабаванняў да рэгістратара; абавязковы дасудовы парадак абскарджання дзеянняў (бяздзеяння) рэгістратара; аўтаматычнае ўнясенне выпраўленняў у рэгістр нерухомасці, звязаных са змяненнем персанальных даных грамадзян або найменняў юрыдычных асоб; змяненне парадку ўзаемадзеяння паміж натарыусамі і рэгістратарамі пры рэгістрацыі нерухомасці.

Таксама сенатары адобрылі законапраекты аб унясенні змяненняў у законы «Аб ліцэнзаванні», «Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Статута Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай абароны». Ратыфікаваны і міжнародныя пагадненні, якія датычацца гарманізацыі заканадаўства дзяржаў ЕАЭС у сферы выканання патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў і ўзаемнага прызнання Беларуссю і Азербайджанам электронных сістэм сертыфікацыі паходжання тавараў.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «Маладзёжны парламент — сур'ёзная школа для прафесійнага і грамадзянскага росту»



Фота БелТА.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА сустрэўся з членамі Маладзёжнага савета (парламента) трэцяга склікання пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Сустрэча прайшла ў Авальнай зале, знакавым месцы не толькі для парламентарыяў, але і для ўсёй краіны.**

«Рады бачыць у гэтай зале столькі маладых, ініцыятыўных людзей. Хацелася б павіншаваць вас з выбраннем у склад Маладзёжнага савета (парламента) трэцяга склікання пры Нацыянальным сходзе. Гэта сур'ёзны этап у вашым жыцці. І я хацеў бы пажадаць вам поспехаў і на жыццёвым шляху, і ў грамадскай, і ў парламенцкай дзейнасці ў далейшым», — адзначыў Ігар Сергяенка. Рашэнне аб стварэнні пры Нацыянальным сходзе Маладзёжнага савета было прынята ў 2020 годзе. Ігар Сергяенка назваў яго вельмі важным. «Хацелася б, каб ён стаў сур'ёзнай школай, дапамог набыць вопыт і веды, якія будуць садзейнічаць вашаму далейшаму прафесійнаму і грамадзянскаму росту, — адзначыў ён. — У вас, нашых юных калег, ёсць свая сфера адказнасці, паколькі вы ўжо ўключыліся ў работу, звязаную з рэалізацыяй дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, праектаў і ініцыятыў, накіраваных на ўключэнне маладога пакалення ў грамадска-палітычнае жыццё краіны. Вы людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, найбольш актыўная, прасунутая, крэатыўная і патрыятычна настроеная частка нашай моладзі».

Ігар Сергяенка адзначыў, што гэта першая падобная сустрэча ў пашыраным складзе, і выказаў упэўненасць, што яна не стане апошняй. «Наша сустрэча праходзіць напярэдадні правядзення найважнейшай выбарчай кампаніі. Выбары Прэзідэнта — гэта заўсёды падзея гістарычнага маштабу і сур'ёзны экзамен на сталасць для дзяржавы і грамадства», — заўважыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. Ён звярнуў увагу, што ў членаў Маладзёжнага савета тут таксама ёсць свая сфера адказнасці. «Вы людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, па-добраму амбіцыйныя, крэатыўныя. А галоўнае — вы гаворыце са сваімі равеснікамі на адной мове. І гэта вельмі важна для захавання тых каштоўнасцяў, якія цэментуюць наша грамадства і дазваляюць беларускаму народу адстойваць свой шлях развіцця», — падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што маладых людзей плануюць прыцягваць і да законатворчай дзейнасці. «Тое, што адбываецца ў Авальнай зале, — гэта толькі вяршыня айсберга. У вас з'явіцца ўнікальная магчымасць стаць не проста сведкамі, а непасрэднымі ўдзельнікамі гэтага працэсу. Вы зможаце наведаць пасяджэнні пастаянных камісій і рабочых груп, парламенцкія слуханні, круглыя сталы, дыялогавыя пляцоўкі, паўдзельнічаць у іншых формах грамадскага абмеркавання законапраектаў, — паабяцаў ён. — Кіраўнік дзяржавы заўсёды нацэльвае парламентарыяў на непасрэдную работу з людзьмі. Быць побач з выбаршчыкамі, жыць іх клопатамі — гэта найважнейшы наш абавязак. Людзей трэба слухаць, з людзьмі трэба размаўляць і належным чынам рэагаваць на тыя пытанні, якія яны перад намі ставяць».

У кожнага з маладых парламентарыяў будзе свой настаўнік з ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. І разам з ім яны змогуць удзельнічаць у тых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў выбарчых акругах, найперш у асабістых прыёмах. «Вы ўбачыце, як няпроста працаваць са зваротамі грамадзян, зможаце зразумець заканадаўчыя тонкасці гэтага працэсу, даведацца, як узаемадзейнічаюць парламентарыі ў вырашэнні праблем выбаршчыкаў з урадам, мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый, грамадскімі аб'яднаннямі», — адзначыў Ігар Сергяенка. Каардынаваць узаемадзеянне членаў Маладзёжнага савета і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будуць кіраўнікі рэгіянальных дэпутацый.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Віталю Юр'евічу Уткіну ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# НЕ БУДАВАЦЬ ПЛАТЫ, А НАЛАДЖВАЦЬ ДЫЯЛОГ

## У Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя на тэму нелегальнай міграцыі і прасоўвання рэгіянальнага супрацоўніцтва

**Беларусь дэманструе ініцыятыву да вырашэння праблемы нелегальнай міграцыі. Аб гэтым заявіў дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ на палях міжнароднай канферэнцыі ў Мінску на тэму нелегальнай міграцыі і прасоўвання рэгіянальнага супрацоўніцтва ў вырашэнні гэтай праблемы.**

### КРЫНІЦА ПРАБЛЕМЫ

«Нягледзячы на тое што нас абвінавачваюць у тым, што Беларусь з'яўляецца крыніцай гэтай праблемы, мы якраз дэманструем практычныя крокі, як знайсці шляхі вырашэння. Чарговы раз Мінск стаў міжнароднай палітычнай экспертнай пляцоўкай па абмеркаванні пытанняў незаконнай міграцыі, — адзначыў дзяржсакратар, паведаміла БелТА. — Праблема нелегальнай міграцыі выйшла на глабальны ўзровень і цяпер захлістае ў першую чаргу Еўропу».

Разам з тым ён падкрэсліў, што на канферэнцыю ў Мінск не прыбылі дыпламаты з краін ЕС, якіх гэта праблема непасрэдна датычыцца. «Якія больш за ўсё аб гэтым крычаць, але чамусьці не хочуць абмяркоўваць і знаходзіць шляхі вырашэння гэтай праблемы, — заўважыў Аляксандр Вальфовіч. — Каб знайсці шляхі вырашэння пытання, трэба садзіцца за стол перагавораў, весці дыялог, выпрацоўваць канструктыўныя сумесныя крокі, арганізоўваць больш цеснае ўзаемадзеянне. Вядома ж, з краінамі-суседзямі — Польшчай, дзяржавамі Балтыі. Мы неаднаразова па лініі МЗС, іншых каналах прапаноўвалі абмяркоўваць, шукаць шляхі вырашэння. А яны ляжаць у шматлікіх плоскасцях».

Ён падкрэсліў, што не Беларусь спарадзіла нелегальную міграцыю і не яна — крыніца адпаведнай праблемы. Але цяпер так здарылася, што краіна на фоне ваеннага канфлікту ва Украіне і іншых фактараў стала асноўным калідорам для нелегальных мігрантаў на шляху ў ЕС. «Мы зацікаўлены не ў будаўніцтве платоў на нашай граніцы, не ў прыгнёце мігрантаў, не ў прыніжэнні, збіванні і знішчэнні... За апошні год мы зафіксавалі 50 выпадкаў гібелі мігрантаў, якіх нам падкінуў Еўрасаюз. З іх боку. Колькасць пакалечаных людзей вылічаецца сотнямі. Трэба сумесна шукаць шляхі вырашэння гэтай праблемы», — заявіў дзяржсакратар.

### ПА ШЛЯХУ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ

Штогод фіксуецца звыш паўтары тысячы затрыманняў незаконных мігрантаў на беларускай граніцы. «Летась намі спынена каля 60 каналаў нелегальнай міграцыі, затрымана звыш 170 кіраўнікоў і каардынатараў, якія займаліся гэтымі пытаннямі, узбуджана пракуратурай звыш 100 крымінальных спраў. Гэта значыць, мы займаемся гэтымі пытаннямі», — заўважыў Аляксандр Вальфовіч.

**Першы намеснік міністра ўнутраных спраў Юрый НАЗАРАНКА** згадаў гісторыю з выяўленнем у васьмі еўрапейскіх краінах членаў міжнароднай арганізаванай злачыннай групы, якая арганізавала канал нелегальнай міграцыі з Расіі і Беларусі праз Польшчу ў краіны Заходняй Еўропы і якая таксама фінансавала тэрарыстычныя арганізацыі. Арганізатары гэтай групы былі арыштаваны ў Польшчы, Германіі, Нідэрландах, Літве, Латвіі, Эстоніі, Швецыі. Але не ў Беларусі, звярнуў увагу першы намеснік кіраўніка МУС, заўважыўшы, што калі б там былі задзейнічаны беларусы, то польскія праваахоўнікі, якія займаліся расследаваннем, не ўпусцілі б шанцу гэтую інфармацыю давесці да шырокай грамадскасці.

Сумежныя з Беларуссю дзяржавы Еўрасаюза замест канструктыўнага дыялога пайшлі па шляху мілітарызацыі прыгранічча, канфрантацыі і ігнаравання пытанняў пагранічнага супрацоўніцтва, прымяняючы радыкальныя меры па вырашэнні міграцыйных праблем, што ўзнікаюць. Аб гэтым заявіў **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанцін МОЛАСТАЎ.** У апошнія гады, паводле яго слоў, кіраўніцтва краін Еўрасаюза, якія мяжуюць з Беларуссю, замест пошуку шляхоў вырашэння праблем значна павялічыла расходы фінансавага сектара на стварэнне так званай жалезнай заслоны, у аснову якой, акрамя дыпламатычных перашкод, пакладзена будаўніцтва інжынерных збудаванняў і загарод. Напрыклад, па заявах польскага боку, выдаткі толькі на ўтрыманне сцяны на граніцы з Беларуссю могуць каштаваць больш за 600 мільёнаў еўра. Гэта не толькі вельмі затратна, але яшчэ і неэфектыўна, і шкодна.


Фота БелТА.

### ПЕРШАРАДНАЯ ЗАДАЧА

Барацьба з незаконнай міграцыяй — першарадная задача міжнароднай супольнасці ў сферы бяспекі. На гэта звярнуў увагу **намеснік дырэктара выканаўчага камітэта рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (РАТС ШАС) Нурмухамед ТУРДУМАМАТАЎ.** Ён адзначыў, што каналы незаконнай міграцыі выкарыстоўваюцца тэрарыстамі для перамяшчэння баевікоў, а асяроддзе нелегальных мігрантаў спрыяльнае для вядзення тэрарыстычнай прапаганды і вярбоўкі, стварэння спячых тэрарыстычных ячэек, якія ўяўляюць асаблівую небяспеку. Толькі на працягу апошніх трох гадоў на прасторы арганізацыі выкрыта больш за 50 каналаў нелегальнай міграцыі, якія выкарыстоўваліся ў тэрарыстычных мэтах.

Штогадовая аперацыя АДКБ «Нелегал» за 17 гадоў дапамагла спыніць два мільёны парушэнняў міграцыйнага заканадаўства. Аб гэтым заявіў **намеснік генеральнага сакратара АДКБ Валерый СЕМЕРЫКОЎ.** Паводле яго слоў, аналіз вынікаў аперацыі «Нелегал» і іншых мерапрыемстваў, якія праводзяцца на нацыянальным узроўні, сведчыць аб тым, што асноўны трафік мігрантаў зыходзіць з краін Паўднёва-Усходняй Азіі, Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, Блізкага і Сярэдняга Усходу. Іх шляхі праходзяць у асноўным праз дзяржавы Цэнтральнай Азіі ў Расію і Беларусь для наступнага транзіту ў краіны Еўрапейскага саюза.

У АДКБ падрыхтавалі праект пагаднення аб супрацоўніцтве ў сферы процідзеяння незаконнай міграцыі, паведаміў Валерый Семерыкоў. Адпаведная сістэма штогод удасканальваецца. Аднак адначасова з гэтым арганізаваныя злачынныя групоўкі ўдасканальваюць формы і спосабы нелегальнай міграцыі, адкрываюцца новыя каналы. Як падкрэсліў Валерый Семерыкоў, агульная праблема павінна вырашацца кансалідаванымі намаганнямі з задзейнічаннем патэнцыялу ўсіх міжнародных і рэгіянальных арганізацый.

### ВАРТА ДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗАМ

Беларусь прымае ўсе намаганні для зніжэння вастрыні гэтай праблемы, але рэальны эфект магчымы толькі пры шчыльным узаемадзеянні з сумежнымі краінамі і сусветнай супольнасцю ў цэлым. «Свет паступова ператвараецца ў палігон глабальнага супрацьстаяння. Ужо не засталося ніводнай сферы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, у якой адсутнічалі б канфрантацыя і напружанасць. І цярпяць ад гэтага мільёны простых грамадзян, якія вымушаны пакідаць свае дамы і краіны ў пошуках лепшага жыцця за мяжой. Нелегальная міграцыя з ліку другарадных даўно перайшла ў разрад глабальных праблем», — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч.

Наша краіна гатова шукаць шляхі вырашэння праблем нелегальнай міграцыі і дзейнічаць сумесна з партнёрамі. Аб гэтым заявіў **міністр замежных спраў Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ.** «Мы проста былі вымушаны арганізаваць гэтую канферэнцыю. Сітуацыя сур'ёзная. На жаль, нас не чуюць. А сёй-той, хто павінен працаваць на гэтым напрамку на Захадзе, нават не хоча чуць», — падкрэсліў Максім Рыжанкоў. Па словах міністра, прычынай нелегальнай міграцыі цяпер з'яўляецца палітыка калектыўнага Захаду на ўсходзе, а дакладней, развязаныя ім канфлікты. Пры гэтым суседзі Беларусі робяць з сябе «фарпост Еўропы», каб павысіць сваю каштоўнасць перад ЕС. Гэта нагода выцягнуць грошы — нібыта на барацьбу з нелегальнай міграцыяй. Адначасова поўнасцю разбураецца ўсё трансгранічнае супрацоўніцтва.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў, што сумеснай эфектыўнай рабоце ў гэтай сферы не садзейнічаюць і санкцыі Захаду ў дачыненні да Беларусі. «Перакана1ны, што ў цяперашнім становішчы наспела неабходнасць фарміравання ў рэгіёне Еўразіі больш эфектыўнай і транспарэнтнай сістэмы вырашэння ўсяго комплексу праблем нелегальнай міграцыі», — заявіў ён. Такая сістэма павінна грунтавацца на міжнародным праве і яго інстытутах. Дзяржсакратар Савета бяспекі звярнуўся да сваіх калег з Польшчы, краін Балтыі і іншых дзяржаў Еўропы: «Беларусь адкрыта да дыялогу па ўсім спектры пытанняў, якія датычацца рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі».

**Пётр ДУНЬКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### За перавыбранне Шольца на пасаду канцлера ФРГ прагаласавалі б толькі шэсць працэнтаў немцаў



Большасць жыхароў Германіі не маюць намеру галасаваць за кандыдатуру дзейнага канцлера ФРГ Олафа Шольца на датэрміновых выбарах кіраўніка ўрада ў лютым. Аб гэтым сведчаць даныя апытання, праведзенага нямецкім выданнем Tagesspiegel. Паводле апытання, грамадзяне ФРГ не лічаць, што Шольц павінен прадоўжыць сваю работу на пасадзе кіраўніка ўрада. Большасць немцаў аддалі б свае галасы Фрыдрыху Мерцу, кандыдату ад Хрысціянска-дэмакратычнага саюза Германіі (ХДС). Паводле даных апытання, за яго гатовы прагаласаваць 44 працэнты апытаных рэспандэнтаў. Яшчэ сем працэнтаў немцаў выбралі б кіраўніком урада міністра эканомікі Роберта Хабека, які прадстаўляе партыю «Зялёных». Шанцы Шольца (Сацыял-дэмакратычная партыя) на гэтым фоне мінімальныя. Напярэдадні прэзідэнт Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер адобрыў дату правядзення датэрміновых парламенцкіх выбараў 23 лютага 2025 года ў выпадку, калі дэпутаты Бундэстага адмовяць у даверы ўраду канцлера.

### General Motors звальняе каля тысячы супрацоўнікаў для скарачэння выдаткаў



Найбуйнейшая амерыканская аўтамабільная карпарацыя General Motors звальняе каля тысячы супрацоўнікаў па ўсім свеце з-за скарачэння выдаткаў і рэарганізацыі кампаніі, паведамляе ABC News. GM і іншыя аўтавытворцы перажываюць пераход на электрамабілі як у ЗША, так і ва ўсім свеце, спрабуючы зразумець, куды інвеставаць капітал. Кампаніі прыйшлося распрацоўваць і мадэрнізаваць мадэлі, якія працуюць на газе, адначасова інвестуючы ў заводы па вытворчасці акумулятараў і зборцы электрамабіляў, а таксама ў мінералы і іншыя дэталі для наступнага пакалення электрамабіляў. Сёлета GM плануе скараціць пастаянныя выдаткі на $2 млрд, паколькі ёй даводзіцца спраўляцца з запаволеннем продажаў у ЗША, пагаршэннем бізнесу ў Кітаі і змяненнем сваёй комплекснай стратэгіі ў дачыненні да электрамабіляў на фоне больш павольнага, чым чакалася, прыняцця іх спажыўцамі. У жніўні карпарацыя General Motors ужо звольніла больш за тысячу супрацоўнікаў, якія працуюць у падраздзяленні праграмнага забеспячэння і паслуг GM.

### У Пампеях увялі абмежаванні на ўваход для барацьбы з празмерным турызмам



Рэкордная колькасць — чатыры мільёны чалавек — наведалі руіны старажытнарымскага горада мінулым летам. Гэта заахвоціла прыняць рашэнне абмежаваць паток турыстаў да 20 тысяч чалавек у дзень і ўвесці персаналізаваныя білеты. Аб гэтым паведаміў Euronews. Археалагічны комплекс увёў гэтыя меры для прадухілення празмернага турызму і абароны сусветна вядомых руін рымскага горада. «Мы працуем над серыяй праектаў, накіраваных на зніжэнне чалавечай нагрузкі на аб'ект, таму што яна можа ўяўляць небяспеку і для наведвальнікаў, і для спадчыны, якая з'яўляецца такой унікальнай і далікатнай», — адзначыў дырэктар парку Габрыэль Цухтрыгель. Паводле яго слоў, парк імкнецца да немасавага турызму.

Па-дэпутацку, па-жаночы

# ЧАС ВЕРЫЦЬ. ЧАС ВЫБІРАЦЬ

**Час ляціць хутка! Здавалася б, зусім нядаўна былі абвешчаныя вынікі выбараў 2020 года, калі беларускі народ у пераважнай большасці аддаў свой голас за свайго Прэзідэнта. Лідара, з якім прайшлі доўгія, складаныя 25 гадоў суверэнітэту. Калі краіна літаральна з кален падымалася і ішла сваім, беларускім шляхам.**



Але не ўсім спадабаўся выбар народа, і краіну, падбухторваючы, хацелі пагрузіць у хаос. Аднак завоблачныя арганізатары пралічыліся, не падумалі, што за гэтую чвэрць стагоддзя Беларусь навучылася сябе абараняць.

Той год, як мы яго завём — дваццаць-дваццаць, — навучыў думаць. Той год навучыў нас шанаваць нашы дасягненні. Той год навучыў нас іншымі вачыма глядзець на сваю гісторыю і не пераставаць захоўваць памяць пра тых, дзякуючы каму мы жывём. Той год вельмі многім адкрыў вочы на тое, што было абсалютна відавочным, але не было дастаткова асэнсаваным — наколькі высокая цана мірнага неба! Скажу больш — як дорага каштуе тое, што ніхто з нас не кладзецца спаць, пакідаючы побач са сваім ложкам ці канапай, як кажуць, «трывожны чамаданчык»... Словам, мы прайшлі ўрок, паўтарэння якога не будзе.

І вось, праз пяць гадоў, мы зноў уключыліся ў выбарчую кампанію. Дакладней будзе сказаць, што ўжо поўным ходам ідзе галоўная палітычная кампанія апошняй пяцігодкі. А галоўная не толькі таму, што мы выбіраем кіраўніка дзяржавы, але і таму, што завяршаецца цыкл палітычнай мадэрнізацыі нашай краіны. Заўважым — мадэрнізацыі, а не рэвалюцыі.

Пасля прыняцця абноўленай Канстытуцыі, змяненні і дапаўненні ў якую абмяркоўвалі ўсёй краінай, неабходна было абнавіць і заканадаўства, што павінна ў поўнай меры адпавядаць новым нормам. Ды чаго ўжо там, не проста абмяркоўвалі, дыскутавалі, спрачаліся, даказвалі, а часам сварыліся, асабліва даказваючы, што на повадзе ніякіх еўракаштоўнасцяў не пойдзем. Не лішнім будзе заўважыць, што менавіта Прэзідэнт быў ініцыятарам усенароднага абмеркавання праекта змен і дадаткаў у Канстытуцыю. І гэта была не проста ініцыятыва, гэта яшчэ раз падкрэслівае, наколькі важныя кіраўніку дзяржавы меркаванне людзей, іх погляд, вопыт. Бо з гэтым галоўным дакументам краіна будзе надалей жыць!

Мяркую, што дзень 23 кастрычніка 2024 года кожны дэпутат восьмага склікання запомніць. Менавіта ў гэты дзень Палата прадстаўнікоў, выкарыстоўваючы сваё зноў-такі канстытуцыйнае права, прыняла рашэнне аб назначэнні выбараў Прэзідэнта краіны 26 студзеня 2025 года.

Цалкам аргументаваная прапанова Цэнтральнай выбарчай камісіі была падтрымана абсалютна аднагалосна дэпутацкім корпусам. Словам, быў дадзены старт.

Сёння махавік выбарчай кампаніі, як гавораць, круціцца поўным ходам. ЦВК літаральна як «гарачыя піражкі» выдае інфармацыю аб ходзе вядзення кампаніі.

Цяпер ідзе збор подпісаў грамадзян за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты, паколькі гэта адзіны спосаб вылучэння. І зноў мы звяртаем увагу, што і заканадаўства прадугледжвае рашэнне менавіта народа, хто можа вылучацца нават кандыдатам у Прэзідэнты. Нягледзячы на зусім непрацяглы перыяд збору, а пачаўся ён 7 лістапада, ужо з лішкам ёсць тая колькасць, якая неабходна для рэгістрацыі. Нагадаю, што выбарчы кодэкс прадугледжвае 100 тысяч.

Літаральна за адзін тыдзень за вылучэнне дзейнага Прэзідэнта свае подпісы паставілі больш чым 700 тысяч чалавек, а цяпер думаю, што не памылюся, калі скажу, што больш чым мільён чалавек. Кіраўнік дзяржавы, будучы зусім сціплым чалавекам, сам адзначыў, што сабранай колькасці дастаткова і магчыма варта спыніць збор подпісаў, аднак узнікае цалкам слушнае пытанне, што рабіць людзям, якія яшчэ не паставілі, а хочуць паставіць свой подпіс. І не будзем забывацца, што перыяд збору подпісаў завяршаецца 6 снежня.

Аднак нашага лідара хвалююць і іншыя прэтэндэнты ў кандыдаты, і ён ведае, што даволі складана будзе ім сабраць подпісы. Прэзідэнт адзначае, што «мяне радуе і вельмі сур'ёзна напружвае», а ён жа мае рацыю, бо за кожным подпісам стаяць вера і давер, які заўсёды імкнецца апраўдаць.

Немагчыма было без усмешкі ўспрымаць каментарый Прэзідэнта наконт выбараў у ЗША, калі Трамп як кандыдат называў «дурніцай» свайго апанента — Камалу Харыс, а яна ж жанчына. Прэзідэнт упэўнены, што ў нас такое проста немагчыма, паколькі любы кандыдат у такім разе страціў бы як мінімум адразу палову галасоў. І гэта сапраўды так.

Сумневаў няма, што далёка не ўсе прэтэндэнты змогуць сабраць неабходную колькасць подпісаў для рэгістрацыі ў якасці кандыдата, і не таму, што дрэнныя, якраз наадварот. Іх смеласць, упэўненасць нават зрабіць пробны крок — гэта абсалютны рэспект. І тое, што двое ўжо знялі свае кандыдатуры, толькі падкрэслівае іх сілу волі і адэкватнае разуменне сітуацыі. Затое яны паказалі заўзятым «змагарам за дэмакратыю» рэальную магчымасць у нашай краіне спрабаваць свае сілы і ўключацца ў перадвыбарную гонку. Нават на такую высокую пасаду, як Прэзідэнт краіны.

Наперадзе важныя этапы перадвыбарнай кампаніі: і завяршэнне збору подпісаў, і рэгістрацыя кандыдатаў, і, вядома, агітацыя...

А людзі, паверце, зробяць свой выбар за таго, у каго вераць больш, нават чым ён сам верыць у сябе.

**Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

Сяброўства

# БАШКАРТАСТАН ВІТАЕ БЕЛАРУСЬ

**У апошнія паўтара года актыўна развіваецца прастора беларуска-башкірскіх літаратурных, медыйных сувязяў. Беларускія пісьменнікі наведваюцца ў Башкартастан. У прыватнасці, ва Уфе пабывалі першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СП Беларусі празаік, паэт Таццяна Дземідовіч. І башкірскія пісьменнікі, журналісты — частыя госці ў Беларусі.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Айгіз БАЙМУХАМЕТАЎ.

**Айгіз БАЙМУХАМЕТАЎ, кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі Рэспублікі Башкартастан (Расійская Федэрацыя)**, ужо не першы раз прыязджае ў Беларусь. Ён быў і арганізатарам Дзён башкірскай літаратуры ў Рэспубліцы Беларусь у кастрычніку 2023 года. Тады ў Мінск прыехалі вядомыя паэты і празаікі Башкартастана, кіраўнік літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў. Наведваў старшыня СП Башкартастана Мінск і Віцебшчыну і ў сакавіку 2024 года. А днямі старшыня Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Башкартастан празаік і публіцыст Айгіз Баймухаметаў і намеснік старшыні СП Башкартастана Іскандэр Хасанаў пабывалі ў Выдавецкім доме «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** пазнаёміў башкірскіх гасцей з парламенцкай і ўрадавай газетай «Звязда», пісьменніцкай газетай «Літаратура і мастацтва», а таксама часопісамі, дзе СП Беларусі з'яўляецца сузаснавальнікам. Зусім нядаўна ва Уфе была выдадзена анталогія беларускай літаратуры на башкірскай мове. Укладальнікі гэтага зборніка творчай дружбы — Айгіз Баймухаметаў і Алесь Карлюкевіч. Анталогія разышлася па бібліятэках розных куткоў рэгіёна Расійскай Федэрацыі. Чытачы адгукаюцца пра яе змест наступным чынам: «Асаблівасць тэматычных абсягаў беларускай літаратуры ў яе чуласці, дабрыні, спакоі...» А ў Мінску рыхтуюцца да выдання зборнікі башкірскай паэзіі і прозы ў перакладзе на беларускую мову.

Кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі Башкартастана падзяліўся развагамі пра супольную працу па прапагандзе найлепшых твораў башкірскіх пісьменнікаў у Беларусі, беларускіх пісьменнікаў — у Башкартастане. Была выказана згода арганізаваць шэраг сумесных творчых конкурсаў, а магчыма — заснаваць і прэмію за найлепшы пераклад твораў беларускіх аўтараў на башкірскую мову. Алесь Карлюкевіч расказаў калегам пра міжнародныя праекты СП Беларусі, пра апошнія выданні твораў беларускіх паэтаў і празаікаў у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, а таксама ў розных краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Алесь Карлюкевіч, у сваю чаргу, нагадаў пра вытокі беларуска-башкірскага літаратурнага сяброўства, пра тое, што яшчэ ў 1936 годзе ў Мінску гасцявалі башкірскія паэты — удзельнікі пленума Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР. На гэтым пленуме адной з тэм для размовы былі і пытанні развіцця башкірскай нацыянальнай паэзіі. А ў 2023 годзе ў Пісьменніцкім парку каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі было пасаджана дрэва ў гонар класіка башкірскай прозы Хадзіі Даўлетшынай.

**Кастусь ХАДЫКА.**

Надвор'е

# ПАДМАРОЗІЦЬ ДА МІНУС 7 ГРАДУСАЎ

## Усё часцей мокры снег

**Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, на гэтым тыдні тэмпература паветра працягне паніжацца і ападкі стануць ісці ўжо ў выглядзе снегу і мокрага снегу, а ноччу будзе падмарожваць да мінус 7 градусаў.**

У аўторак надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, днём па захадзе краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Чакаецца перавага воблачнага надвор'я. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца слабы галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, паўднёвы парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, максімальная днём 1—6 градусаў вышэй за нуль. Атмасферны ціск будзе слаба расці.

Перамены чакаюцца 20—21 лістапада, калі надвор'е ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону з цэнтрам над Балтыйскім морам. У сераду часам пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвай чвэрці парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература ўначы мінус 2 — плюс 4 градусы, а максімальная ўдзень 1—8 цяпла.

У чацвер ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём месцамі па краіне пройдуць ападкі (мокры снег, дождж). На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер заходняй чвэрці парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература ноччу ад 2 марозу да 3 цяпла, а максімальная днём ад мінус 1 да плюс 4 градусаў.

Кароткачасовы, мокры снег пройдзе месцамі па краіне ў пятніцу. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад нуля да мінус 5 градусаў, а максімальная днём ад мінус 2 градусаў да плюс 3.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца снег, мокры снег, месцамі ўзмацненне ветру парывамі 15—20 м/с, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — мінус 2 — плюс 3 градусы.

У нядзелю ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць снег, мокры снег, днём па захадзе — з дажджом. Месцамі на дарогах можа быць галалёдзіца, удзень на захадзе слабы галалёд і ўзмацненне ветру парывамі 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы — да мінус 7 градусаў, а максімальная ўдзень — мінус 2 — плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# НА АДНОЙ ХВАЛІ

## Выставы, фудтракі, спартыўныя лакацыі

У суботу пляцоўка перад спартыўным комплексам «Бабруйск-Арэна» ператварылася ў святочны міні-гарадок, дзе можна было купіць сувенір, агледзець выставы, ацаніць дасягненні айчыннага аўтапрама, паслухаць канцэрт, смачна паесці. Падлеткі круціліся каля спартыўных снарадаў, спрабавалі падняць штангу. Трэнер-выкладчык Магілёўскай абласной спецыялізаванай дзіцячай спартыўнай школы прафсаюза «Спартак» Ігар Бегуноў з гатоўнасцю ім дапамагаў.

— Вельмі вясёлае мерапрыемства, добрае, — адзначыў ён.

Дзевяцікласнік Кірыл Страшноў прыйшоў на трэніроўку з сябрамі і зацікавіўся лакацыямі марафону.

— Тут так шмат розных забаў, — з захапленнем сказаў ён. — Цудоўнае свята!

Яшчэ з адныімі школьнікамі, вучнямі СШ № 4 Мацвеем і Мікітам, пазнаёмілася каля інтэрактыўнай выстаўкі «Подзвігі і лёс партызан у дакументах», якую прэзентавалі выдавецкі дом «Беларусь сёгодня» і Нацыянальны архіў. Хлопцы ўважліва разглядалі інфармацыю на ралапах, дзе было шмат унікальных фотаздымкаў, узнагародныя лісты і баявыя характарыстыкі вядомых камбрыгаў, Герояў Вялікай Айчыннай вайны, радавых байцоў партызанскіх атрадаў.

— Нам цікавае гэта мерапрыемства, — прызналіся яны. — Даведаліся шмат рознага новага. Заходзілі і ў перасовачны музей. Убачылі мноства цікавых экспанатаў: зброю, дакументы. А яшчэ паглядзелі айчынныя аўтамабілі, вельмі прыгожыя і якасныя.

## Мурал адзінства

Сімвалічная выява з'явілася на сцяне жылога дома № 18 на вуліцы з красамоўнай назвай Народнага адзінства. Гэты мікрараён не падобны на іншыя ў Бабруйску — тут наўпрост на вачах растуць шматпавярховікі (якраз непадалёк узводзіцца яшчэ адзін жылы дом), неабсяжны прастор, у дварах шмат гульнявога і спартыўнага абсталявання. На адкрыццё прыйшло шмат моладзі. Арт-аб'ект сімвалічны: на далонях — мужчынскай, жаночай і дзіцячай — контуры роднай краіны, а пасярод — надпіс «Будучыня Беларусі ў тваіх руках».

Удзел у адкрыцці мурала ўзялі **намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Уладзімір КНІГА, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вольга ЖУК, Аксана ПРЫХОДЗЬКА.**

— Мы сёння дорым Бабруйску прыгожы арт-аб'ект ад нашай моладзі, байцоў студэнцкіх атрадаў, — вітаў прысутных Аляксандр Лук'янаў. — Дзякуй Бабруйскаму гарвыканкаму і Магілёўскаму аблвыканкаму за падтрымку ў гэтай справе. Сэнс малюнка вельмі глыбокі, ён сімвалізуе адзінства нашага народа. Адзінства пачынаецца з малога — сяброўства ў нашых калектывах, сем'ях і паступова ахоплівае ўсю краіну. У нашай дзяржаве створаны ўсе магчымасці для моладзі. І гэты мікрараён пабудаваны, каб маладыя сем'і, маладыя спецыялісты жылі ў камфортных умовах. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, ён упэўнены ў нашай моладзі, яна разумее сваю адказнасць за краіну. Сённяшнія дзеці ў будучыні стануць кіраўнікамі, міністрамі, старшынямі выканкамаў, пойдуць у прыватныя структуры, на заводы, і кожны на сваім месцы з годнасцю будзе прадстаўляць нашу агульную краіну, бо будучыня Беларусі ў нашых руках.

— Для Бабруйска гонар і радасць прымаць «Марафон адзінства», — павіншаваў бабруйчан ад імя гарвыканкама намеснік старшыні Уладзімір Кніга. — Наш горад першы ў Магілёўскай вобласці прыняў маштабнае мерапрыемства. Марафон мае на ўвазе доўгую дыстанцыю і вялікую колькасць удзельнікаў. Разам мы адчуваем адзінства. Калі мы разам, нам ніхто не страшны. Дзяржава праводзіць суверэнную, незалежную палітыку, і нас спрабуюць зламаць. Нам трэба прасякнуцца духам гэтага свята, духам адзінства. Няхай такія аб'екты з'яўляюцца ў большай колькасці і працуюць на наш росквіт.

Сярод тых, хто прыйшоў на адкрыццё арт-аб'екта, былі і маладыя сужэнцы Карына і Сяргей Вільчынскія са сваёй дачушкай Палінай. Яны пабудавалі тут жыллё паўтара года назад і вельмі гэтаму рады.

— Мікрараён развіваецца, шмат моладзі, — усміхаюцца сямейнікі. — Кватэра падабаецца, дзякуй дзяржаве за падтрымку. Жыллё будавалі з дапамогай ільготнага крэдыту як маладая сям'я. Што датычыцца мерапрыемства, то яно нам цікавае, таму і далучыліся. Мурал з'явіўся якраз на доме, які па суседстве з нашым. Адразу неяк утульней стала.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)










## Ці лёгка быць знакамітым

Гэта і шмат іншых пправакацыйных пытанняў задаў удзельнікам «Знакавай сустрэчы» галоўны рэдактар «Альфа Радыё» Вадзім Шэпет і бабруйчане. Мерапрыемства адбылося ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Удзельнікамі сустрэчы сталі спрэс медыйныя персоны, у тым ліку і бабруйскага паходжання — **заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан АЛЯХНО** і **21-разовы паралімпійскі чэмпіён Ігар БОКІЙ.** Кампанію ім склаў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН.**

Сярод прысутных было шмат моладзі, у тым ліку спартыўнай. Насця Рымарава і Эліна Хаткевіч займаюцца гімнастыкай і прыйшлі на сустрэчу разам з сяброўкамі і трэнерам. Прызналіся, што ім цікава ўбачыць адразу некалькіх вядомых асоб, асабліва Ігара Бокага. Для будучых пакарыцеляў спартыўнага Алімпа гэта кумір. Дзяўчынкі сціпла прызналіся, што хацелі б даведацца, у колькі гадоў ён пачаў займацца плаваннем і як зразумеў, што гэта яго від спорту.

Вадзім Гігін, Ігар Бокій, Руслан Аляхно шчыра і з гумарам расказвалі пра сябе, свае адносіны да любімай справы, да радзімы.

— Прыехалі ў горад з добрым настроем, адзначылі, як ён цудоўна ўпрыгожыўся да «Марафону адзінства», — заўважыў Вадзім Гігін. — Нашы «НЯсумныя НЯлекцыі», сустрэчы, выставы ў нашым горадзе, а ўсе беларускія гарады — нашы — ствараюць атмасферу свята.

Руслан Аляхно не хаваў, што заўсёды з трапятаннем прыязджае ў Беларусь, а Бабруйск — гэта горад, дзе ён чэрпае сілы, сустракаючыся з бацькамі, сябрамі.

Ігар Бокій з гонарам нясе званне бабруйчаніна, горада свайго дзяцінства, дзе ён рос, вучыўся і, як ён сам прызнаўся, было, і заняткі прагульваў. Затое ёсць што ўспомніць.

Ці лёгка быць знакамітым? Пытанне, як той казаў, на засыпку.

— Я адкажу з пункту гледжання артыста, але ў кожнай сферы — гэта праца, — паразважаў Руслан Аляхно. — Гэта веды, якія прыходзяць з гадамі. А таксама праца і яшчэ раз праца. Тое, што перададзена мне педагогамі, я перадам сваім дзецям, магчыма, яшчэ і вучням.

З артыстам згодны і Ігар Бокій.

— Праца з шасці гадоў, штодзённыя заняткі ў басейне, упартыя трэніроўкі і пастаянна новыя мэты, — прызнаўся ён. — Гэта цяжка, але камеры і вядомасць — яшчэ цяжэй, чым трэніравацца.

Вадзім Гігін успомніў жартаўлівую гісторыю, як, плывучы ў басейне, да яго падплыў чалавек і паведаміў, што ў яго пытанне як да дэпутата.

# З БАБРУЙСКАМ



— Прыйшлося выслухоўваць, — усміхнуўся народны выбраннік. — Калі сур'ёзна, то вядомасць дысцыплінуе. Пастаянна даводзіцца думаць пра тое, што на цябе глядзяць.

А вось самымі яркімі і моцнымі падзеямі ў сваім жыцці спікеры назвалі нараджэнне дзіцяці і атрыманне высокіх узнагарод з рук Прэзідэнта.

— Вельмі хвалюючыя хвіліны перажываеш, калі ўпершыню бачыш сваё дзіця, гэту зорачку, і потым, калі яна мяне віншуе з днём нараджэння, які, дарэчы, супадае з днём бацькі, 21 кастрычніка, — расказваў Вадзім Гігін. — І, безумоўна, заўсёды важныя сустрэчы з Прэзідэнтам, яго словы, калі ён уручае ўзнагароды або нешта расказвае. Вось Ігар Бокій нядаўна сустракаўся з Прэзідэнтам на адкрыцці басейна. Гэта вялікая адказнасць, бо ты прадстаўляеш не толькі сябе, але і ўсю спартыўную суполку, людзей, якія чагосьці дасягнулі ў спорце. Прэзідэнт праз яго звяртаецца да ўсіх.

Наогул, сустрэча прайшла як на адным дыханні ў атмасферы шчырасці і добразычлівасці. Бабруйчане яшчэ доўга не адпускалі яе ўдзельнікаў. Задавалі пытанні, фатаграфаваліся.

## Квэст па-бабруйску

У суботу каля спартыўнай арэны, дзе праходзіў квэст «Гэта ўсё маё роднае», было горача. Асабліва шмат прыйшло моладзі. Усе 10 «заліковых» станцый размясціліся на адной лініі. Нехта танцаваў «бульбу-дэнс», нехта праходзіў выпрабаванні на валоданне беларускай мовы, нехта практыкаваўся на веданне страў беларускай кухні. Дадатковыя 20 балаў атрымлівалі тыя каманды, якія выканалі дамашняе заданне. Трэба было сфатаграфавацца ўсёй камандай на фоне бабра, запісаць відэапрызнанне ў любові Бабруйску на фоне чыгуначнага вакзала і выкласці гэта ў сацсетках з зададзенымі хэштэгамі. Шмат каманд так і зрабілі. Але былі і такія, якія для таго, каб дадаць тыя 20 балаў, пасля рэгістрацыі садзіліся на таксі і хуценька ехалі на вакзал да бабра — выконвалі дамашняе заданне. Квэст быў яшчэ ў разгары, а бабруйчане па ўдзеле ў ім ужо пабілі ўсе рэкорды, якія існавалі да таго, як «Марафон адзінства» завітаў у гэты горад.

— 81 каманда болей чым 600 чалавек, — удакладніў **другі сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ІВАНЕНКА.** — Анлайн зарэгістраваліся 75 каманд, астатнія непасрэдна на пляцоўцы, і падыходзяць новыя. Бабруйск — пяты пункт марафону і ўжо пастаўлены абсалютны рэкорд па наведванні квэсту. Дагэтуль рэкардсменам быў Пінск, але Бабруйск перакрыў гэты вынік. Вельмі прыемна бачыць не толькі навучальныя ўстановы, людзі прыходзяць сем'ямі, шмат працоўнай моладзі, людзей, якім цікава праверыць свае веды. Ёсць каманды, дзе ўдзельнікам па 5-6 гадоў і яны ўжо паўнавартасна адказваюць на пытанні, танцуюць з усімі. А ёсць каманды 80+ — бабуля разам з унучкамі. Гэты квэст абсалютна для ўсіх, бо «Марафон адзінства» — адзінства ва ўсім: у краіне, сярод моладзі, грамадства. Адзінства не залежыць ад узросту, сацыяльнага статусу і месца працы.

На думку Аляксандра Іваненкі, «Марафон адзінства» — гэта ўнікальны фармат, бо ўключае цэлы шэраг новых праектаў, якіх раней не было.

— Важна, што адбываецца абмен вопытам, сюды прыязджаюць жыхары іншых гарадоў з іншых абласцей, — канстатуе ён. — Гэта добрая магчымасць пазнаёміцца з асаблівасцямі рэгіёнаў Беларусі. «Марафон адзінства» аб'ядноўвае людзей у межах рэгіёнаў і ўсёй краіны, у межах агульнай гісторыі.

## Час выбраў нас

Завяршальным акордам знаходжання ў Бабруйску акцыі стаў канцэрт «Час выбраў нас» — яркае запамінальнае відовішча, якое сабрала тысячы гледачоў. Яны падпявалі, махалі сцяжкамі, ва ўсім дэманструючы адзінства, якому прысвечаны марафон. **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ** павіншаваў бабруйчан і перадаў добрыя пажаданні ад імя кіраўніка краіны.

— Навінка бабруйскага марафону — адраджэнне канцэртаў у цэхах прадпрыемстваў. Гэта ініцыятыва і даручэнне Прэзідэнта, які вельмі скрупулёзна аналізуе ўсе марафоны. Цудоўна, што два дні наша краіна глядзіць рэпартажы і сюжэты з Бабруйска. Прэзідэнт адносіцца да Бабруйска асабліва, рэальна лічачы яго шостым абласным цэнтрам нашай краіны. Гэты горад асаблівы, ён — лідар.

З прывітальнымі словамі са святочнай сцэны да бабруйчан звярнуўся **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** Ён адзначыў, што нічога так не яднае людзей, як сумесныя мерапрыемствы.

— Мы адзіныя, а людзі адзіныя, калі думаюць пра адно і тое ж — пра краіну, пра нашу Беларусь, — падкрэсліў ён. — 30 гадоў мы жывём у міры і згодзе ў суверэннай і прыгожай Беларусі. Нам трэба зрабіць яе яшчэ лепш і прыгажэй. Гэта неабходна не толькі нам, але і нашым дзецям і ўнукам. І гэта павінны зрабіць мы, бо час выбраў нас.




## Наступны прыпынак — Магілёў

Акцыя завітае ў горад на Дняпры ўжо праз некалькі дзён — 22 лістапада. І «Звязда» абавязкова раскажа падрабязнасці «Марафону адзінства» з Магілёва.

— Мы вырашылі анансаваць наступныя гарады крыху раней, каб у гэтых гарадах жыхары пачалі рыхтавацца да наведвання мерапрыемстваў, — паведаміла **кіраўнік працоўнай групы па арганізацыі і правядзенні рэспубліканскай акцыі «Марафон адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА.** — Пасля Магілёва едзем у Віцебскую вобласць — Віцебск і Оршу. Усіх запрашаем, будзем рады бачыць жыхароў гэтых гарадоў!

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*г. Бабруйск.*





БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов
в форме открытого аукциона
по продаже недвижимого имущества –
**ОАО «АСБ Беларусбанк»**
**(Гомельское областное управление № 300)**

**ЛОТ 1:**
**объект № 1 – изолированное помещение с инвентарным номером 340/D-2118823,**
общей площадью – 348,0 м$^2$,
расположенное по адресу:
Гомельская обл., г. Речица, ул. Ленина, 52А-1;

**объект № 2 – изолированное помещение с инвентарным номером 340/D-2118824,**
общей площадью – 1612,5 м$^2$,
расположенное по адресу:
Гомельская обл., г. Речица, ул. Ленина, 52А-2.

Общая начальная цена продажи составляет 2 140 770,34 белорусского рубля (два миллиона сто сорок тысяч семьсот семьдесят белорусских рублей 34 копейки) с учетом НДС по ставке 20 %.

Сумма задатка – 3 000,00 рублей (три тысячи рублей 00 копеек).

Победителем аукциона оплачивается имущество, относящееся к объекту недвижимости, согласно приложению № 1 на общую сумму 72 601,57 белорусского рубля (семьдесят две тысячи шестьсот один белорусский рубль 57 копеек) с учетом НДС по ставке 20 %.

**Открытый аукцион состоится 20.12.2024 в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, актовый зал (помещение на четвертом этаже).**

Заявления на участие принимаются в рабочие дни с 9.00 до 16.30, в пятницу – **до 15.30 по 18.12.2024 включительно** по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а (каб. 113), г. Речица, ул. Ленина, 52А (каб. 2-10).

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефонам: (0232) 50-92-25, (8029) 180-88-05 – Ладыженко Светлана Станиславовна, в Речице 8 (029) 668-73-95 – Кузьмина Ольга Александровна.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается с ОАО «АСБ Беларусбанк» и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка, по 18.12.2024 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

иностранным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического или физического лица – доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель). Доверенность от имени нерезидента Республики Беларусь должна быть легализована в установленном законодательством порядке, перевод на белорусский или русский язык нотариально заверен.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий полномочия (приказ о назначении на должность, или выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены с учетом НДС. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи и документацией на объекты.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.**
**Продавец: ООО «ДобГидроИнвест», г. Добруш, пр-т Луначарского, 2А, УНП 491153125.**

**Торги состоятся 04 декабря 2024 года в 11.00**
**по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** 1) После реализации Покупатель обязан в течение 3-х месяцев освободить помещения от технологического оборудования, материалов и мусора; 2) Возместить затраты продавцу, связанные с предпродажной подготовкой объекта, в течение 10-ти календарных дней после проведения аукциона в сумме 3 600,00 бел. руб. | | | |
| **Информация о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000005001371** общей площадью **1,5305 га** (право постоянного пользования). Местоположение (адрес): Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 323. Целевое назначение земельного участка: для содержания и обслуживания административно-производственных зданий. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000005008163** общей площадью **0,6464 га** (право аренды). Местоположение (адрес): Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 323. Целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания административно-производственных зданий по ул. Барыкина, 323 | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 300/С-3930**, общей площадью 36,2 кв. м; наименование: **здание проходной**; назначение: здание специализированное иного назначения. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3929**, общей площадью 3,7 кв. м; наименование: **здание автозаправки**; назначение: здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: ограждение, калитка, ограждение, ограждение, молниеотвод. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3931**, общей площадью 57,8 кв. м; наименование: **склад масел и ГСМ;** назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности: подвал. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3932,** общей площадью 211,6 кв. м; наименование: **здание материального склада**; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3928**, общей площадью 1939,1 кв. м; наименование: **здание административно-производственного корпуса**; назначение: здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: три пристройки, два склада, навес. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3933,** общей площадью 95,3 кв. м; наименование: **здание кузницы;** назначение: здание специализированное для металлургического производства и (или) металлообработки. **Адрес (местоположение):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 323. **В состав лота входит оборудование, сооружения, передаточные устройства (полный перечень см. на сайте https://ocenkaservis.by)** | **858 432,96** | 25 752,98 |

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (029) 636-83-87, Пахомов Александр Владимирович.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ООО «ДобГидроИнвест»):** р/с BY69 BAPB 3012 2018 6001 2000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 491153125, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 ноября 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 02 декабря 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах.

